Усю увагу арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў!

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 283 (4189)
Субота 17 кастрычніка
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

Калгас „Чырвоны Баец" паказвае ўзор барацьбы за якасныя паказальнікі калгаснай вытворчасьці

Не дапушчаць штучнага зьніжэньня непадзельных капіталаў, даць жорсткі адпор „пявацкім" спробам параўнаць гультая з ударнікам, больш рашуча змагацца з правааапартуністычным самацёкам у разьмеркаваньні даходу

Рашуча пакончыць з адставаньнем транспарту

Транспарт адыгрывае выключна адказную ролю ў выкананьні ўсяго народна-гаспадарчага пляну. У пытаньне выразнай і бесьперабойнай работы чыгункі, у пытаньне поўнага ажыцьцяўленьня патрабаваньняў, якія да яе прад'яўляюцца, зараз непасрэдна ўпіраецца вырашэньне важнейшых вузлавых задач нашага гаспадарчага разьвіцьця.

Улічваючы гэта, партыя аддае транспарту вялізарную ўвагу, мабілізуе вакол баявых праблем транспартнага будаўніцтва мільённыя масы рабочае клясы. Партыяй і ўрадам у вядомай пастанове ЦК УсеКП(б) і СНК СССР былі даны ганэральныя дырэктывы па ўмацаваньні транспарту, паказаны канкрэтныя шляхі падцягваньня яго да ўзроўню перадавых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэта пастанова, якая выклікала магутны ўздым вытворчай актыўнасьці шырокіх мас рабочых-чыгуначнікаў, зараз-жа дала значныя рэзультаты ў паляпшэньні работы.

Аднак, за апошні пэрыяд часу «на чыгунках заўважаюцца яўныя аднакі зрыву дасягненьняў». ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у пастанове ад 1 кастрычніка канстатавалі, што «работа чыгуначнага транспарту ў ліпені і жніўні параўнальна з чэрвенем пагоршылася і ў цяперашні момант не забясьпечвае выкананьня пляну асеньня-зімовых перавозак».

Гэта ацэнка, даная транспарту ў цэлым, ЗУСІМ АДПАВЯДАЕ І СТАНОВІШЧУ СПРАЎ НА ЧЫГУНКАХ БССР.

Важнейшы паказальнік работ — СЯРЭДНЯ-СУТАЧНАЯ ПАГРУЗКА—гаворыць аб яўна нездавальняючых рэзультатах. За трэці квартал плян сярэднясутачнай пагрузкі транспартам БССР выкананы усяго толькі на 85 проц., прычым жнівень (74,5 проц.) дае зьніжэньне супроць ліпеня (91,4 проц.). У верасьні, хоць і ёсьць некаторы пад'ём, але плян застаецца выкананым выключна на 87,4 проц. і ШТОДЗЕННАЯ НЕДАГРУЗКА ў верасьні ПЕРАВЫШАЕ 100 ВАГОНАЎ.

Невыкананьне ёсьць і па іншых паказальніках транспфінпляну. Так, па ЗВАРОЦЕ ВАГОНАЎ У СУТКІ верасьнёўскія заданьні ня выкананы па ўсіх раёнах апрача Гомелю. Аналягічнае-ж становішча і па сярэдня-сутачным ПРАБЕГУ ТАВАРНАГА ПАРАВОЗА. Застаецца яшчэ вельмі высокай колькасьць ЗДАРЭНЬНЯЎ на чыгунках.

Асабліва адстае Віцебскі чыгуначны вузел. Тут прарывы найбольш глыбокія. Карэньні іх з усёй паўнатой ускрыты апошняй пастановай сакратарыяту ЦК КП(б)Б.

З падобным становішчам на транспарце нельга далей мірыцца ні аднаго дня. З адставаньнем чыгункі трэба рашуча і неадкладна пакончыць.

Учора ў друку апублікован загад наркома шляхоў зносін т. АНДРЭЕВА аб асеньня-зімовых перавозках. АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАГА ЗАГАДУ — КЛЮЧ ДА ДАЛЕЙШАГА АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ ТРАНСПАРТУ, ДА ВЫКАНАНЬНЯ ІМ СВАІХ АДКАЗНЫХ ЗАДАНЬНЯЎ.

Адзэй з асноўных прычын пагоршаньня работы чыгункі ў апошнія месяцы зьяўляецца аслабленьне ўвагі да важнейшага вагара барацьбы за высокія паказальнікі работы — СПАРАНАЙ ЯЗДЫ. Абязьлічка, непадпадкі ў сыстэме кіраўніцтва застаюцца ворагамі транспарту.

На ўпярэдкаваньні апэрацыйнага кіраўніцтва, на бязьлітаснай барацьбе з абязьлічкай павінна быць у першую чаргу сканцэнтравана ўвага партыйных арганізацый транспарту.

Трэба палажыць канец фармальнаму правядзеньню спаранай язды, сапраўды правесьці прымацаваньне брыгад да паравозаў, строга караць зрыўшчыкаў спаранай. Кожны паравоз павінен цьвёрда мець свайго гаспадара, сапраўднага дырэктара.

Неабходна карэнным чынам ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ ДЭПО, упарадкаваць тут сыстэму кіраўніцтва. Барацьба за выразную работу дэпо — неадлучная частка барацьбы за спараную язду, супроць абязьлічкі.

З паляпшэньнем работы дэпо непарыўна зьвязана вырашэньне другой важнейшай задачы—РАМОНТУ. Барацьба за высокую якасьць, супроць паўторнасьці, ліквідацыя тут абязьлічкі, разгортваньне КАНКРЭТНАГА САЦСПАБОРНІЦТВА і ўдарніцтва — усё гэта зьяўляецца бявымі пытаньнямі ўмацаваньня транспарту.

Сярод мерапрыемстваў, намечаных новым кіраўніцтвам НКШЗ, значэньне выключнай важнасьці набывае загад аб ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ ВАГОНАЎ. Значэньне гэтага мерапрыемства цяжка пераацаніць. Поўная ліквідацыя абязьлічкі ва ўсіх зьвеньнях транспарту, барацьба за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў нямысьліма пры абязьлічанасьці вагоннага парку.

Замацаваньне вагонаў за чыгункамі па нумарным уліку зьяўляецца буйнейшым крокам па шляху зьберажэньня вагоннага парку, скарыстаньня яго з максымальнай эфэктыўнасьцю, паскарэньня звароту вагонаў.

У гэтай-жа сувязі ва ўсю шырыню паўстае пытаньне аб МАРШРУТЫЗАЦЫІ ЦЯГНІКОЎ І СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫІ ГРУЗАВОГА РУХУ.

На аснове паляпшэньня работы дэпо, поўнага замацаваньня спаранай язды, на аснове ліквідацыі абязьлічкі вагонаў транспарт павінен забясьпечыць шпаркае павышэньне ЯКАСНЫХ паказальнікаў сваёй работы. НА ПРАЦЯГУ ЧАЦЬВЕРТАГА КВАРТАЛУ СУТАЧНАЯ РАБОТА ПАРАВОЗАЎ У РУХУ ПАВІННА ПАВЯЛІЧЫЦЦА МІНІМУМ НА АДНУ ГАДЗІНУ, СЯРЭДНЯ-СУТАЧНАЯ РАБОТА ВАГОНАЎ У РУХУ — НА 1 ГАДЗІНУ І 12 МІНУТ, ШТО ЗАМЕНІЦЬ РАБОТУ ЗВЫШ ТЫСЯЧЫ ДАДАТКОВЫХ ПАРАВОЗАЎ І КАЛЯ 90.000 ДАДАТКОВЫХ ТАВАРНЫХ ВАГОНАЎ.

Намаганьні і энэргія партарганізацый і рабочых транспарту БССР павінны быць поўнасьцю мабілізаваны на ажыцьцяўленьне гэтага баявога заданьня.

Загад тав. Андрэева трэба неадкладна давесьці да шырокіх мас чыгуначнікаў, зрабіць яго праграмай штодзённай работы.

Транспартнікі БССР павінны стаць у перадавыя калёны змагароў за бальшавіцкія тэмпы работы. Ня можа быць сумненьняў, што пад кіраўніцтвам партарганізацый, ажыцьцяўляючы шэсьць указаньняў тав. СТАЛІНА, выконваючы дырэктывы новага бальшавіцкага кіраўніцтва НКШЗ, вядучы бязьлітасную барацьбу з апартунізмам, чыгуначнікі БССР ліквідуюць прарывы ў сваёй рабоце, з гонарам выканаюць свае абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай.

На аснаве зьдзельшчыны перамаглі

ЖЛОБІН. На аснове зьдзельшчыны калгас «Чырвоны баец», Папаратнянскага сельсавету, мае значныя посьпехі ў правядзеньні як веснавой сяўбы, так і ў выкананьні асенніх сельска-гаспадарчых кампаній. Замест 15.424 працадзён, якія неабходны былі паводле пляну, патрачана за год толькі 11.958 працадзён, што дало значную эканомію ў працоўнай сіле.

У калгасе праведзена ўжо папярэдняе разьмеркаваньне даходаў. **Усе таварныя лішкі на суму ў 9.000 руб. (калгас напічвае 28 гаспадараў) калгасьнікі аднагалосна пастанавілі здаць дзяржаве.**

Калгас поўнасьцю забясьпечыў кармамі сьвінагадоўчую фэрму, малочную і рабочую жывёлу. Склаў страхавыя, бравыя фонды выключна ў адпаведнасьці з дырэктывай НКЗ і Калгасцэнтру.

Калгасьнікі за сваю працу ў гэтым годзе атрымліваюць значна больш уладжаю, чым у мінулым годзе, і куды больш, чым яны атрымлівалі ў адна асобнай гаспадарцы, асабліва бядняцкая частка.

Разьмеркаваньнем даходаў па колькасьці і якасьці працы ў калгасе канчаткова і беспаваротна замацавана зьдзельшчына, як самая лепшая форма для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу.

ЗАКРЭЎСКІ.

З 200 калгасаў толькі ў 7 праведзена папярэдняе разьмеркаваньне

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Раённыя арганізацыі яшчэ не пераключыліся, не ўзяліся па-сапраўднаму, па-бальшавіцку за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Шмат гаворыць, пішуць, галасуюць, а справа ня зрушваецца.

Да разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасах не прыступілі. Зараз работнікі райкалгасаюзу, камэрцыйных устаноў стаяць у баку ад гэтай галоўнейшай задачы і ні адна асоба ў дапамогу калгасам не накіравана. Райпрафсавет пакуль што сьпіць і нічога ня робіць для таго, каб разварушыць прафарганізацыю на барацьбу за ўмацаваньне калгасаў.

Есьць вялікая пагроза зрыву свячасовага і правільнага разьмеркаваньня даходаў, бо на 12 кастрычніка гэта **работа праведзена толькі ў 5-7 калгасах, а ўсяго калгасаў у раёне больш за 200.**

Белкалгасцэнтр павінен ужыць адпаведныя меры ў адносінах да работнікаў Касьцюковіцкага райкалгасаюзу, якія недаацэньваюць палітычнага значэньня кампаніі разьмеркаваньня даходаў у калгасах, як самага лепшага сродку для іх арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня.

ВАЎЧКОЎ.

Тры палітычныя памылкі

Лёзьнянскі райкалгасаюз у мэтах папулярызацыі пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР склаў «табліцу прыкладнага разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах на 1931 г.». Да гэтай табліцы прыкладаюцца падробязныя тлумачэньні на 4-х старонках. На вопыце разьмеркаваньня даходаў ільнаводча-жывёлагадоўчай гаспадаркі, райкалгасаюз думаў навучыць іншыя калгасы, як трэба правесьці правільнае разьмеркаваньне. На справе атрымалася якраз адваротнае — сам райкалгасаюз дапусьціў грубыя палітычныя памылкі.

Па-першае, штучна зьніжаны адлічэньні ў непадзельны капітал і ў іншыя грамадзкія фонды. З агульнага даходу калгасу (без насеньня і кармовых фондаў) вылічылі плату МТС і іншыя выдаткі ў той час, як трэба вылічаць толькі сельгаспадатак, страхоўку і плату па крэдытах.

Па-другое, усю натуральную частку перавялі на грошы і вылічвалі кошт працадня ў грошах замест вылічэньня, колькі на працадзень прыпадае натуральнай часткі.

Па-трэцяе, даецца наступная палітычна-шкодная дырэктыва:

«Калі калгасьнікі, які ўдарна працуе, па яго колькасьці працадзён прылічваецца паасобных прадуктаў, як сена, жыта, аўса і г. д. больш, чым яму патрэбна, апошні замест гэтых прадуктаў павінен атрымаць у гаспадарцы грошы ў дадатак да тых, якія ён атрымаў па працадзёх. Такое разьмеркаваньне ў значнай ступені павінна прывучыць калгасьнікаў да правільнага і эканомнага выдаткаваньня прадуктаў у сваёй гаспадарцы».

Лёзьнянскі райкалгасаюз на сваёй палітычнай блізарукасьці парашыў, што для таго, каб прывучыць ударніка да «эканомнага выдаткаваньня прадуктаў» трэба пакінуць яму гадавую пайковую норму, а за рэшту выдаць грошы. Такая дырэктыва толькі на руку клясаваму ворагу. На аснове такога разьмеркаваньня гультай, які выпрацаваў меншую колькасьць працадзён, можа атрымаць харчоў якраз столькі, колькі атрымлівае ўдарнік. Зразумела, што зацікаўленасьць да далейшага ўзьнаўленьня прадукцыйнасьці працы ў значнай частцы калгасьнікаў, якія па-ўдарнаму працавалі, можа панізіцца.

Дырэктыва Калгасцэнтру гаворыць аб тым, «каб разьмер харчовага збожжа, якое атрымліваюць калгасьнікі, выпрацаваўшыя больш лік працадзён, быў бы большым у параўнаньні з тымі калгасьнікамі, якія працавалі менш і горш і выпрацавалі менш працадзён». Калгасцэнтр сваёй дырэктывай дабіваецца, каб ударнік атрымаў больш, чым гультай, а Лёзьнянскі райкалгасаюз наадварот — хоча насадзіць ударніка на пайк хоча «вялікім пастом» прывучыць яго да «эканоміі».

Калі ад часткі збожжа, якая разьмяркоўваецца, у калгасьнікаў застаюцца таварныя лішкі, то гэтыя лішкі добрасумленныя калгасьнікі добраахвотна (а не ў парадку загаду), на пастанове сходу, у арганізаваным парадку здаюць дзяржаўным і камэрцыйным арганізацыям і атрымліваюць за гэта прамтавары і грошы.

Лёзьнянскі райкалгасаюз павінен тэрмінова выправіць дапушчаныя памылкі.

В.

Не дапушчаць штучнага раздуваньня насенных і кармовых фондаў

СЛУЦАК, 16. (БЕЛТА).

На 10-га кастрычніка з ліку 170 калгасаў праведзена папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў у 124 калгасах. Першыя вынікі паказалі, што асноўная калгасная маса раёну стаіць за разьмеркаваньне калгасных даходаў па колькасьці і якасьці працы, па працадзёх.

Аднак, там, дзе ня было забясьпечана партыйнае кіраўніцтва, дапушчан рад скажэньняў асноўных прынцыпаў разьмеркаваньня. Так, у калгасе «Лошчыца», Мілешкаўскага сельсавету, старшыня калгасу разам з сакратаром пры падлічэньні даходаў штучна зьнізілі ўраджай: жыта з гэктара улічылі 3 цэнтн., бульбы 50 цэнтн., канюшыны — 10 цэнтн. і г. д. У выніку вышла зусім мізэрная доля даходаў на працадзень. Такія «вынікі» ўраджайнасьці старшыня давёў да ведама калгасьнікаў, што бязумоўна зьявілася найлепшай агітацыяй супроць калгасу.

У калгасе «Іскра Ільліча» бульбу перадзялілі па едаках і канвэерам пагналі яе з поля да хаты. Гэту работу правёў пралезны ў калгас кулак Багдановіч. Тое-ж самае наглядаецца і ў калгасе «Чырвоны партызан».

Ёсьць шмат фактаў, калі **пры падлічэньні даходаў штучна раздуваюцца кармовыя, насенныя і страхавыя фонды у выніку чаго скарачаецца таварнасьць гаспадаркі, зрываюцца пляны загатовак, зьмяншаюцца непадзельныя фонды і грашовыя даходы саміх калгасьнікаў.**

Слуцкаму раённаму камітэту партыі неабходна зараз-жа прыняць рашучыя меры да ліквідацыі дробна-буржуазнай ураўнілаўкі, не дапушчаць штучнага раздуваньня насенных і кармавых фондаў, прыняць захады, каб праца па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах была максымальна скарыстана для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Жыткавіцкія работнікі штучна зьніжаюць непадзельныя капіталы

У газэце **«Прымежны камунар»** ад **«Сталіна» 210 руб.** прадуктамі і кармамі і **75 руб.** грашыма».

Бачыце, калгасьнік ужо ня прымае ўдзелу ў разьмеркаваньні даходаў сваёй калектыўнай гаспадаркі: ён атрымлівае сярэдні заработак.

Такое **падвядзеньне сыстэмы разьмеркаваньня даходаў пад сыстэму заработнай платы па сутнасьці зьяўляецца «пявацкім» загібам.**

Памылкі калгасу імя Сталіна трэба ўлічыць усім калгасам, якія праводзяць разьмеркаваньне сваіх даходаў.

Жыткавіцкі райкалгасаюз павінен выправіць гэтыя памылкі ў часткі вымены парадку і разьмеру адлічэньняў у непадзельны і грамадзкія фонды згодна ўказаньняў НКЗ і Калгасцэнтру БССР ад 3/IX г.г.

Асноўныя прынцыпы разьмеркаваньня даходаў у калгасах не павінны парушацца. Выправіўшы свае «пявацкія» памылкі, газэта «Прымежны камунар» павінна разгарнуць шырокую кампанію за правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах.

С. К—ў.

Зьдзельна-прэміяльную сыстэму— у кожны ільнаводчы калгас

Пастанову калегіі НКЗБ у трохдзенны тэрмін давесьці да кожнага калгасу і калгасьніка

Адзначыць, што з боку некаторых раёнаў ня прынята належных крокаў да свячасовага пад'ёму трасты са сьцепішчаў і выгрузкі з мачыльных ям, што пагражае зьніжэньню якасьці і выхаду ільнавалакна.

У мэтах недапушчэньня страт прадукцыі ад пералежкі і перамочкі ільну, калегія Наркамзему БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць загадчыкаў райза і старшынь райкалгасаюзаў зараз-жа даць сутачныя заданьні па сельсаветах, па асобных калгасах і вёсках па пад'ёме трасты са сьцепішчаў і выгрузкі з мачыльных ям, не дапускаючы пералежкі і перамочкі трасты, устанавіць жорсткі кантроль за выкананьнем гэтых заданьняў.

Для абгаварэньня пытаньня аб свячасовым пад'ёме трасты са сьцепішчаў і выгрузкі з мачыльных ям правесьці пашыраныя нарады і сходы ў калгасах і вёсках.

2. У мэтах ажыцьцяўленьня канвэернага спосабу апрацоўкі ільну, у дадатак да пастановы Наркамзему БССР і Белкалгасцэнтру (газ. «Сав. Беларусь» ад 4-X 31 г.), абавязаць райза, райкалгасаюзы і праўленьні калгасаў забясьпечыць арганізацыю ў калгасах спэцыяльных брыгад па апрацоўцы, прычым кожная брыгада павінна атрымаць поўную колькасьць трасты і апрацаваць яе да вапакна.

3. Кожная брыгада разьбіваецца на тры групы:

а) група па сушцы і возцы трасты;
б) група па мяцьці;
в) група па трапаньні

Група па сушцы і возцы трасты складаецца да 7 чалавек, норма выпрацоўкі групы ўстанаўляецца 4 тоны трасты ў зьмену за што ёй налічваецца 8 працадзён.

За 100-процантнае выкананьне нормы выпрацоўкі па сушцы і возцы група атрымлівае надбаўку да ўстаноўленай ацэнкі ў разьмеры 10 проц.

Пры перавыкананьні нормы выпрацоўкі ацэнка павышаецца: за першыя 10 проц. звыш нормы на 20, за другія 10 проц. — на 40 проц. і г. д.

4 тоны запісваюцца 8,8 працадзён.
4,4 тоны запісваюцца 10,5 працадзён.
4,8 тоны запісваюцца 12,25 працадзён.

Пры недавыкананьні нормы выпрацоўкі працадні налічваюцца толькі за фактычную выпрацоўку, выходзячы з нармальнай ацэнкі.

Нормы выпрацоўкі і ацэнка работ па мяцьці ўстанаўляецца наступная:

	Пры рабоце на 6-ці вальнай мялцы	Пры рабоце на 3-х вальнай мялцы
Склад групы	7 чалавек.	6 чалавек
Норма выпрацоўкі ў зьмену	2,00 тон	0,75 тон
Ацэнка работ	6,5 працадзён.	5,0 працадзён.

Абавязаць загадчыкаў райза і старшынь райкалгасаюзаў забясьпечыць круглясутачнае скарыстаньне ільнамялак.

За 100-процантнае выкананьне нормы выпрацоўкі групы па мяцьці атрымліваюць надбаўку да ўстаноўленай ацэнкі ў разьмеры 10 проц.

Мяцьце на 6-ціпарвальнай мялцы ў адну зьмену:
2,00 тон—запісваецца 7,20 працадзён.
2,20 тон—запісваецца 8,65 працадзён.
2,40 тон—запісваецца 10,25 працадзён.

Мяцьцё на 3-хвальнай мялцы ў адну зьмену:
0,75 тон—запісваецца 5,5 працадзён.
0,83 тон—запісваецца 6,5 працадзён.
0,90 тон—запісваецца 7,5 працадзён.

При невыкананьні нормы выпрацоўкі па мяцьці працадні налічваюцца толькі за фактычную выпрацоўку, выходзячы з нармальнай ацэнкі.

Склад групы па трапаньні залежыць ад колькасьці прамятай трасты. Трапаньне вапакна робіцца на падставе індывідуальнай зьдзельшчыны, выходзячы з наступных норм выпрацоўкі і ацэнкі работы:

Пры трапаньні ільну які быў прамяты:	на 6-ціпарвальнай мялцы.	На 3-х вальнай мялцы.
Норма выпрацоўкі ў зьмену:	16 кгр.	14 кгр.
Ацэнка работы:	1,25 працадзён	1,25 працадзён.

За 100-процантнае выкананьне нормы выпрацоўкі трапальшчык атрымлівае надбаўку — 15 проц., г. зн. замест 1,25 працадня налічваецца 1,45 працадня.

При перавыкананьні норм выпрацоўкі ацэнка работы трапальшчыка ўстанаўляецца:

При трапаньні ільну, які прамяты на 6-ціпарвальнай мялцы:
16 кгр. запісваецца 1,45 працадня.
17 кгр. запісваецца 1,55 працадня.
18 кгр. запісваецца 1,65 працадня.
19 кгр. запісваецца 1,75 працадня.
20 кгр. запісваецца 1,90 працадня.
21 кгр. запісваецца 2,25 працадня.

При трапаньні ільну, які прамяты на 3-хвальнай мялцы:
14 кгр. запісваецца 1,45 працадня.
15 кгр. запісваецца 1,55 працадня.
16 кгр. запісваецца 1,65 працадня.
17 кгр. запісваецца 1,80 працадня.
18 кгр. запісваецца 1,95 працадня.
19 кгр. запісваецца 2,10 працадня.

При недавыкананьні нормы выпрацоўкі па трапаньні працадні налічваюцца толькі за фактычную выпрацоўку, выходзячы з нармальнай ацэнкі работы.

4. Праўленьням калгасаў абавязаць брыгадзіраў і старшынь груп сачыць за якасьцю апрацоўкі ільну, прадастаўшы ім права ня прымаць, а варочаць калгасьнікам для дадатковай апрацоўкі дрэнна прамяты або пратрапаны лён, а таксама зьніжаць ацэнку работ, калі нельга гэты лён апрацаваць дадаткова.

5. Брыгады па апрацоўцы ільну павінны быць укамплектаваны з лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, якія паказалі высокую прадукцыйнасьць працы ў веснавой сяўбе і пры ўборцы ільну. Брыгадзірамі вылучаць перадавых калгасьнікаў, якія праявілі сябе ў калгасе, як добрыя арганізатары вытворчасьці.

На брыгадзіраў ускласьці адказнасьць за свячасовую падвозку трасты да сушань і мялак, за свячасовае снабжэньне апаламі, лямпамі, газай, кнатамі і інш., за правільны ўлік выпрацоўкі і за якасьць вапакна.

6. Абавязаць праўленьні калгасаў забясьпечыць дачу пэўных вытворчых заданьняў па апрацоўцы ільну брыгадам, групам і кожнаму калгасьніку, а таксама наладзіць улік работы, якая выкананa брыгадай, групай і асобнымі калгасьнікамі.

7. Абавязаць праўленьні калгасаў арганізаваць штодзённы запіс налічаных працадзён, уносячы гэты запіс кожныя пяць дзён у працоўныя кніжкі.

8. У памяшканьнях, дзе збіраюцца калгасьнікі (праўленьні калгасаў, сельсаветы, хаты-чытальні, клюбы, чырвоныя куткі і г. д.), вывешваюцца штодзённыя зводкі аб ходзе апрацоўкі ільну, зьмяшчаючы ў гэтых зводках выпрацоўку як брыгад, груп у цэлым, так і асобных калгасьнікаў.

9. Для прэміяваньня раёнаў, саўгасаў, МТС, калгасаў, брыгадзіраў і калгасьнікаў-ударнікаў за датэрміновую апрацоўку і здачу (продаж дзяржаве вапкна), выдзяліць 50.000 руб., з якіх на 40.000 руб. устанавіць наступныя прэміі:

1 мэдпункты па 1.000 руб. — 4.000 р.
4 сталоўкі па 1.000 руб. — 4.000 р.
11 дзіцячых ясьляй па 1.200 руб. — 13.200 руб.
5 хат-чытальнь па 800 руб. — 4.000 руб.
12 дзіцячых садоў па 800 руб. — 9.600 руб.
4 пазьні, пральні па 750 руб. — 3.000 руб.
22 бібліятэкі па 100 руб. — 2.200 р.

10. Прапанаваць горацкай занальнай станцыі ільну і канапель бездакладна арыентаваць грамадзкасьць на свячасовы пад'ём трасты са сьцепішчаў і шырока інфармаваць масы аб тэрмінах ляжаньня ільну ва ўмовах бягучага году шляхам зьмяшчэньня на старонках друку раду артыкулаў па гэтым пытаньні.

11. Белкалгасцэнтру, пад асабістую адказнасьць нам, старшыні праўленьня т. Стрэле, у 2-хдзённы тэрмін даць канкэтныя ўказаньні райкалгасаюзам у адпаведнасьці з гэтай пастановай.

12. Абавязаць райза і райкалгасаюзы у 3-хдзённы цэрмін давесьці гэту пастанову да калгасаў і калгасьнікаў і забясьпечыць яе ажыцьцяўленьне.

Нарком земляробства БССР
РАЧЫЦКІ.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, НАЗНАЧАНЫ НА 23 КАСТРЫЧНІКА, АДКЛАДВАЕЦЦА
Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ

ЗЯБЛІВА

Кароткія тэрміны веснавой сяўбы

патрабуюць поўнага выкананьня плянаў зяблевага ворыва

80 коняй не магружаны

СІРОЦІНА. У Сіроцінскім сельсавеце на 10-га кастрычніка заазяблена толькі 10 гэкт. з заданьня 1.677.

Усе магчымасьці для выкананьня гэтага заданьня ёсьць. Напрыклад, у калгасе **«Чырвоны пуцілавец»** не скарыстоўваецца 80 рабочых коняй, а між тым плян зяблева выкананы на 20 проц.

Неабходна расстаўіць правільна наяўныя сілы, вылучыць пастаянныя брыгады калгасьнікаў, якія-б працавалі на зяблеве да скарачэньня гэтай кампаніі.

Гудок.

Саўгасы павінны быць у першых радох

Папярэднія даныя аб ўраджайнасьці паказваюць, што ўраджайнасьць збожжавых у саўгасах БССР вышэй, чым у калгасах на 18,18 проц., яравых—на 19,11 проц.

Аднак, гэта ні ў якім разе нас задаволіць ня можа. Саўгасы, якія ўладаюць вялікай тэхнічнай магчымасьцю, павінны мець ураджай значна большы. Для гэтага патрэбна скарыстаць усе дасягненьні агратэхнікі. У прыватнасьці адным з такіх мерапрыемстваў зьяўляецца зяблева. Таму выкананьне пляну зяблева ў тэрмін і поўнасьцю мае важнае гаспадарча-палітычнае значэньне.

Па сыстэме саўгастрэсту 1 інш. саўгасных сыстэмах у гэтым годзе патрэбна ўзяць 148.170 гэктараў зяблева.

Ход зяблева па саўгасах, паводле даных на 10 кастрычніка, прымушае біць трывогу. Саўгасы выкапалі толькі 16,7% заданьня. Саўгасы Белканторы Сьвінавода, якія павінны ўзяць амаль палову данага заданьня саўгасу, знаходзяцца ў глыбокім тыле. Яны выкапалі ўсяго 11,4 проц. пляну зяблева. Такое становішча і па другім трэсьце, дзе заазяблена 14,8 проц.

Саўгасныя трэсты ня кіруюць гэтай адказнейшай кампаніяй. Рад трэстаў ня ведаюць нават, як праходзіць зяблева па іх саўгасах (Маслатрэст, сельгас калёны НКЮ і інш.).

Прамова тав. Якаўлева абавязвае кіраўнікоў саўгасаў быць перадавікамі ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці. Трэба гэту прамову давесьці да кожнага рабочага саўгасу і накіраваць энтузіязм рабочых саўгасу на выкананьне пляну зяблева.

Х.

Спыніць безадказныя адносіны таварнай станцыі да перавозкі грузаў у МТС

КОЙДАНАВА, 15. (БЕЛТА).

Койданаўская МТС выканала плян зяблева ўсяго на 50 проц.

Менская таварная станцыя сваімі безадказнымі адносінамі да перавозкі грузаў у МТС зрывае пасьпяховую працу трактарнай калёны. Так, заданьня таварн. станцыі 3-га кастрычніка пафта складам 5 бочак аўтолу для МТС дастаўлены ў Койданава толькі 12 кастрычніка. У выніку гэтага **45 трактараў** (70 проц. усяго парку) **10-га і 11-га кастрычніка прымушаны былі стаяць.** Такія выпадкі безадказных адносін таварнай станцыі паўтараюцца вельмі часта.

За жнівень і верасень месяцы кожны трактар прастаяў у сярэднім 13 дзён. За гэтыя дні трактары недавыпрацавалі 4.095 гэкт.

Дрэнная справа і з запаснымі часткамі для трактараў і плугоў. Беладдзяленьне Трактарацэнтру не здавальняе заявы МТС аб запасных частках.

„Выберам бульбу, тады возьмемся зяблю"

ЛЕПЕЛЬ. (Наш спэц. кар.). Плян зяблевага ворыва ў Лепальскім раёне выкананы толькі на 13 проц. Узарана 3.034 гэкт. замест пляну 23.000.

Дырэктыва партыі і ўраду аб фарсаваньні тэмпаў зяблевага ворыва ігнаруецца. 30 проц. конскай цягавай сілы не пераключаны на зяблева і нават **дырэктыва аб пераключэньні цягавай сілы невядома калгасам.** Раённыя арганізацыі не займаюцца праверкай выкананьня сваіх дырэктыў.

Пастаянныя брыгады калгасьнікаў на зяблева ня вылучаны. У радзе калгасаў панае апартуністычная тэорыя чарговасьці кампаній. Так, у калгасах **«Чырвоны прамень», «Усход», «Іэабеліна», «Чырвонае Мацюшына»** на пытаньне — чаму не зяблюць—адказваюць: **«Трэба выбраць бульбу, а потым будзем зяблець».**

Трэба пакласьці канец самацёку і арганізаваць зяблева.

П. А.

6 сельсаветаў, якія зрываюць зяблевую кампанію

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Уздым зяблева па Жлобінскім раёне праходзіць зусім нездавальняючымі тэмпамі. На 10-га кастрычніка ўзьнята ўсяго 11,8 проц. заданьня.

Некоторыя сельсаветы, дзякуючы правааапартуністычнай недаацэнцы гэтай важнейшай кампаніі, дагэтуль не давялі плянаў зяблевага ворыва да калгасаў і вёсак (**Казіміраўскі і Новамаркаўскі** сельсаветы). У гэтых сельсаветах ніводнага гэктара не заазяблена. У **некаторых калгасах ёсьць тэндэнцыя зусім не зяблець.** Гэта тэндэнцыя, **якая прадыктавана ня кім іншым, як клясавым ворагам—кулаком,** не сустракае рашучага адпору з боку раённых арганізацый.

У радзе сельсаветаў зусім забыліся пра аднаасобны сэктар. Не вядзецца ніякай работы сярод аднаасобнікаў па растлумачэньні карысьці зяблевага ворыва і, як вынік гэтага, маем, што аднаасобнікі Матевіцкага, Мармальскага, Бухарынскага і Сяляпянскага сельсаветаў не заазяблілі ніводнага гэктара.

Патрэбен карэнны зрух у ходзе гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. РК КП(б)Б і земельна-калгасныя раённыя органы павінны мабілізаваць масы на ўдарнае правядзеньне зяблева. Трэба даць рашучы адпор тэндэнцыям адкласьці зяблевае ворыва.

Машніцкі.

175.000 тон бульбы Ленінграду

Бульба застравае на чыгуначных станцыях

Неадкладна наладзіць рэгулярную падачу вагонаў для адгрузкі бульбы

Загатоўчыя арганізацыі абавязаны строга выконваць календарныя пляны адгрузкі

Забясьпечыць бесьперабойную адгрузку бульбы

Усім вучастковым пракурорам

З АТРЫМАНЫХ ВЕСТАК АБ ХОДЗЕ АДГРУЗКІ З БССР БУЛЬБЫ ДЛЯ ЛЕНІНГРАДУ ВІДАЦЬ, ШТО НЕКАТОРЫЯ РАЁННЫЯ ВЫКАНАЎЧЫЯ КАМІТЭТЫ І МЯСЦОВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ АДДАЮЦЬ ГЭТАМУ ПЫТАНЬНЮ НАЛЕЖНАЙ УВАГІ. ТАК, ПА РАДЗЕ РАЁНАЎ ВАГОНЫ, ЯКІЯ ПАДАЮЦЦА ДЛЯ ПАГРУЗКІ БУЛЬБЫ, НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, ШТО ГЭТЫЯ ВАГОНЫ БЫЛІ ТУДЫ ВЫТРАБАВАНЫ. У ТОЙ САМЫ ЧАС У ДРУГІХ РАЁНАХ ПАДВЕЗЕНАЯ ДА СТАНЦЫІ БУЛЬБА НЕ ПАГРУЖАЕЦЦА З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ПАРАЖНЯКА.

ТАКОЕ СТАНОВІШЧА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АБСАЛЮТНА НЕЦЯРПІМЫМ І ПАВІННА БЫЦЬ БЕЗАДКЛАДНА ЗЬНІШЧАНА. УСЕ ВІНАВАТЫЯ У НЯПОЎНЫМ СКАРЫСТАНЬНІ ПАДАНАГА ДЛЯ ПАГРУЗКІ БУЛЬБЫ ПАРАЖНЯКА, А ТАКСАМА НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЎШЫЯ СВАЯЧАСОВАЙ ПАДАЧЫ ВАГОНАЎ ДЛЯ ПАГРУЗКІ БУЛЬБЫ, ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

ПРАПАНУЮ ЎСІМ ВУЧАСТКОВЫМ ПРАКУРОРАМ УСТАНАВІЦЬ НАГЛЯД ЗА ХОДАМ АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ З БССР, ПРЫЦЯГВАЮЧЫ АСОБ, ВІНАВАТЫХ У ЗАГРУЗЦЫ СТАНЦЫІ І НЕСКАРЫСТАНЬНІ ПАРАЖНЯКА ПАД ПАГРУЗКУ, ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

ПРАКУРОР РЭСПУБЛІКІ

Касьянская парт'ячэйка на службе ў кулака

Апартуністычнае ігнараваньне вытворчага ўмацаваньня калгасаў, прытупленьне клясавай пільнасьці кіраўнікоў ячэйкі разьвязалі рукі кулацтву ў яго імкненьні ўзарваць калгасы з сярэдзіны

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ КУЛАЦКІХ АГЕНТАЎ, АЧЫСЬЦІЦЬ С.-Г. АРЦЕЛІ АД САЦЫЯЛЬНА-ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ УСЕ СІЛЫ, УСЮ ЭНЭРГІЮ НА ВЫКАНАНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗАДАЧЫ—НА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ

Касьянскі сельсавет у сувязі з ліквідацыяй Сьвіслацкага раёну далучан некалькі году таму назад да Асіповіцкага раёну. У сельсавеце існуе партыйная ячэйка, якая аб'ядноае 5 членаў і 5 кандыдатаў партыі.

Гэта ячэйка ня працаму ўсяго свайго існаваньня ніякіх канкрэтных задач, якія вынікоюць з гэнаральнай лініі партыі, перад сабой не ставіла і практычнай работы не праводзіла. Кожны член і кандыдат партыі ў рабоце меў сваю «асабістую» лінію працаваў пасвойму, па сутнасьці выконваючы сацыяльны заказ клясава-варожых кулацкіх элементаў.

Ячэйка зусім не цікавілася пытаньнямі клясавай лініі ў рабоце сельсавету, сельскагаспадарства, пытаньнямі работы калгасаў, арганізацыяй новага калгаснага прыпіву і гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Кулацкія аб'яднаньні

У сельсавеце існуе чатыры калгасы, якія аб'ядноюць 104 сялянскіх гаспадаркі, г. зн. 15,6 проц. усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак сельсавету. Калгасы ў сваёй пераважнай большасьці арганізаваны ўвесну 1931 г. ініцыятарамі па арганізацыі калгасаў былі кулацка-заможныя элементы, якія складалі ініцыятыўныя групы і праводзілі ўсю арганізацыйную работу. У результаце гэтага — усе без выключэньня калгасы засьмечаны кулакамі, былымі жандарамі, паліцэйскімі, гандлярамі і спекулянтамі. У асобных калгасах процант сацыяльна-варожага элементу даходзіць да 80. Так, у калгасе імя Варашылава, які арганізован у 1930 г., з 28 гаспадарак 23 гаспадаркі належаць кулакоў.

Кулакі будучы індывідуальна абкладзенымі і падлягаючы высяленьню за межы раёнаў праз арганізацыю ілжэкалгасу вываліліся ад індывідуальнага абкладаньня, ад высяленьня і нават праз сельсавет як «сумленныя калгаснікі» дамаліся аднаўленьня ў выборчых правах.

У калгасы прынята шмат гаспадарак, якія ў мінулым мелі па некалькі дзесяткаў гектараў зямлі, па 10 і больш коняй, па 6-8 кароў, па 50-60 жалод нчод, якія мелі свае ўласныя прадпрыемствы, гандлявалі на рынку да ўступленьня ў калгас. Дзесяткі кулакоў па часу ўступленьня ў калгас змогі захаваць за сабой надзвычай моцныя і буйныя гаспадаркі: на 16-20 гектараў зямлі, па 3-5 коняй, па 3-5 кароў і т. д.

Перад тым, як уступіць у калгасы, значная частка кулакоў, ліквідуючы і заможнікаў разбазарылі сваю маемасьць, а частка маемасьці, якая засталася, да гэтага часу не абагулілі. Так, па калгасе імя Леніна 12 гаспадарак катэгарычна адмовіліся абагуліць жывёлу, інвэнтар, посевы яравых і азімых.

Ігнаруючы дырэктывы партыі аб рабоце з беднатой і батрацтвам, робячы вид, што ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва ажыцьцяўляецца гэнаральная лінія партыі, партыйная ячэйка ўзяла над сваю непасрэдную абарону кулакоў, ліквідуючы і заможнікаў, дала ім непасрэдную магчымасьць узацавацца ў калгасах, захаваць за сабой маемасьць, сродкі вытворчасьці і прадукцыйную жывёлу. Па сутнасьці ўся работа сельскага савету, партыйнай ячэйкі і спажывецкай кааперацыі была накіравана на патрымальнае сацыяльна-варожых кулацкіх элементаў, супроць бедняты, батрацтва і маломорных сераднякіх гаспадарак.

Ячэйка добра ведаючы, што ў калгасах сельсавету налічваецца ня менш як 40 проц. кулакоў, ліквідуючы і заможнікаў ігнаральна не прыняла ніякіх захадаў, каб ачысьціць калгасы ад сацыяльна-варожага элементу. Калгас імя Варашылава па сутнасьці зьяўляецца тыпічным кулацкім аб'яднаньнем. Загадчыкам млыну гэтага кулацкага аб'яднаньня да апошніх дзён зьяўляўся сакрэтар партыйнай ячэйкі Васькоўіч, членам праўленьня камуніст-настаўнік Савонкаў. Страціўшы ўсякую клясавую чуласьць, стаўшы на шлях непасрэдага супрацоўніцтва з кулакамі і сацыяльна-варожымі элементамі, гэтыя «камуністы» дапамагалі кулакам ачысьціць свае аб'яднаньні ад бедняцкіх і батрацкіх элементаў.

Беднату і батракоў выключалі!

Карыстаючыся выключнай безьдзейнасьцю партыйнай ячэйкі сельсавету і камуністаў-кіраўнікоў, кулакі і ліквідаторы та ўсіх без выключэньня, калгасах захапілі ў свае рукі кіраўніцтва, усю работу накіроўвалі на тое, каб скампрамэтаваць у вачох вакольнага бядняцка-сераднякога сялянства ідэю калектывізацыі, каб праз разбурэньне калгасаў давесьці немагчымасьць існаваньня калектыўнай гаспадаркі. Карыстаючыся дапамогай апартуністаў, кулакі дамаглися зьняцьця з работы старшыні калгасу імя Варашылава—батрака тов. Гэдага. Тав. Руды быў вызваллен ад абавязкаў старшыні калгасу з прычыны яго малапісьменнасьці (?!). Ослабаніўшыся ад работніка, які стрымліваў кулацкія імкненьні і імкнуўся ачысьціць калгас ад кулакоў, кулакі на пасаду старшыні вызначылі відомага кулака-эксплёататара Дашчука Сьцяпана. Рабочы, 25-тысячнік тав. Бялюк, які быў прысланы ў калгас, быў выкінут з калгасу праз некалькі тыдняў пасьля прыезду.

Такі-ж малюнак з падборам «кіраўнікоў» мы назіраем і ва ўсіх астатніх калгасах сельсавету. Пры дапамозе, канчаткова страціўшых усякую партыйную чуласьць апартуністаў, кулакамі было ўстаноўлена сваё кулацкае кіраўніцтва ва ўсіх калгасах.

Не так даўно ў калгасе імя Леніна быў зьняты з работы і выключан з калгасу загадчык гаспадаркі, бедняк, былы партызан тав. Сапаўёў Данілла. Сапаўёў кулакамі быў абвінавачан у продажы калгаснай прадукцыі на прыватным рынку. Пры высьвятленьні выявілася, што продаж прадукцыі калгасу на прыватным рынку Сапаўёву быў даручан членамі праўленьня з матывіроўкай: «Неабходны гроші—за што-б там ні стала тэба прадаць.

Гэты факт з усёй выразнасьцю паказвае аб хітрай замаскаванай барацьбе кулакоў з беднотой і батрацтвам, паказвае як абнаглеўшыя кулакі ў мэтах аслабаненьня сваіх кулацкіх аб'яднаньняў ад людзей, якія прышлі ў калгас з намерам сапраўды будаваць сацыялістычную гаспадарку, дамагаюцца кампрамэтацыі лепшых работнікаў.

У тым-жа калгасе імя Леніна група абнаглеўшых кулакоў і іх сыноў на працягу доўгага часу адкрыта сядзеваліся над жалчынамі батрачкамі, якія ў часе арганізацыі калгасу былі прыняты выключна для таго, каб прыкрыць сакраўдныя памеры і імкненьні кулацтва, прыкрыць кулацкую сутнасьць і прыгоду арганізаванага калгасу. Кулакі адкрыта прапанавалі батрачкам Перапілёвай, Самоўіч, Рудзей і Багун пакінуць калгас, бо «будзеш шмат працаваць і нічога не атрымаеш».

Калі батрачкі катэгарычна адмовіліся выйсьці з калгасу, над імі пачалі безчалавечна зьдзекавацца. Асьвяроўшыя кулакі ня сьпіліся нават перад тым, каб распусьціць хлусьню, што батрачкі хворыя сіфілісам, што з гэтай прычыны ім нельга даручаць работы ў даічных ясьлях на скотным двары, у полі і г. д. Не адна з батрачак гэтых зьдзекаў ня вытрымала, яны па чарзе выйшлі з калгасу.

Па-кулацку ліквідавалі абязьлічку

Канчаткова расправіўшыся з актыўнымі батрачкамі і беднякамі, вынаўшы з калгасаў былых чырвоных партызан, рабочых 25-тысячнікаў, якія былі накіраваны партыяй для кіруючай работы ў калгасах, кулакі, ліквідуючы і заможнікі прыступілі да канкрэтнай рэалізацыі сваёй кулацкай праграмы. У справаздачах калгасаў можна знайсьці матар'ялы аб тым, што ліквідавана абязьлічка, усе калгасьнікі пераведзены на зьдзельшчыну, што арганізаваны ўдарныя брыгады і г. д. Пасводзе справаздачаў атрымліваецца ўражаньне, што ў калгасах блішчуча ажыцьцяўляюцца дырэктывы партыі аб зьдзельшчыне, аб ліквідацыі абязьлічкі, аб арганізацыі новага калгаснага прыпіву, бо калгасамі за вясну і лета гэтага году прынята некалькі дзесяткаў гаспадарак, але справа ў тым, што пераважная большасьць гэтых гаспадарак зьяўляюцца кулацка-заможнымі.

На самай-жа справе ў калгасах абязьлічка ліквідавана па-кулацку. Не абагульваючы інвэнтара і цягавай сілы, праўленьні калгасаў склалі сьпісы, у якіх паказалі, што інвэнтар і коні прымацаваны да калгасьнікаў. У кожнага з кулакоў і заможнікаў да гэтага часу застаўся ў асобістым карыстаньні інвэнтар, коні і кароўы. Аб зьдзельшчыне і аб разьмеркаваньні даходаў паводле дырэктыў партыі і пастановы Калгасцэнтру ня можа быць ніякіх і размоў. Даходы і авансы разьмяркоўваюцца падушна, выходзячы з прыпушчу моцнасьці гаспадаркі. Так, заможнік Ліцьвіненка Рыгор, які з сваёй сям'ёй на працягу 1931 г. у калгасе адпрацаваў ня больш, як 180 працадзён атрымаў прадуктаў у лік авансу ў дваццаць разы больш, чым напрыклад бедняк Сапаўёў, сям'я якога ў калгасе адпрацаваў больш як 400 працадзён.

Не адзін з калгасаў Касьянскага сельсавету ня выканаў заданьняў ураду аб здачы (продажы) таварнай прадукцыі, гэта ў той час, як на прыватны рынак за восень прадана некалькі пудоў масла, сала, некалькі дзесяткаў цэнтнэраў хлеба.

Партыйная ячэйка скацілася ў апартуністычнае балота, стала на шлях супрацоўніцтва з сацыяльна-варожымі кулацкімі элементамі і па сутнасьці дапамагала кулакам скампрамэтаваць ідэю калектывізацыі ў вачох вакольнага бядняцка-сераднякага сялянства. Работнікі былога сьвіслацкага раёнаму ні адзін раз за ўвесь час існаваньня ячэйкі глыбока не праворылі і ня вывучылі работы ячэйкі, не праворылі, як ячэйка ажыцьцяўляе гэнаральную лінію партыі, як яна змагаецца з правазапартыйстычнай практыкай. Толькі таму, што сваячасова ня былі зьняты з работы і ня выключаны з партыі людзі, якія канчаткова страцілі клясавую чуласьць, пачылася зьвязаліся з кулакам, Касьянскі сельсавет аказаўся ў такім становішчы.

Сакратарыят ЦК, які гэтымі днямі заслухаў паведамленьне інструктара ЦК аб становішчы Касьянскай ячэйкі, прыняў цэлы рад арганізацыйных мерапрыемстваў і даручыў ЦКК КП(б)Б у бліжэйшыя дні ўжыць рашучыя захады да аздараўленьня партыйнай ячэйкі, да ачышчэньня калгасаў ад сацыяльна-варожых і кулацкіх элементаў.

Партарганізацыі павінны ўлічыць урокі Касьянскай ячэйкі, мабілізаваць усю масу камуністаў на бязьлітасную барацьбу з праявамі правага апартунізму, на рашучае ачышчэньне калгасаў ад сацыяльна-варожых элементаў.

ЭЛЬ.

Віцебскія фабзавучы працуюць з перабоямі

Адсутнасьць патрэбных памяшканьняў, дрэнная пастаноўка вытворчага навучаньня зьніжаюць якасьць падрыхтоўкі кадраў

Сваячасовае сканчэньне капітальнага будаўніцтва і рамонту школ, паляпшэньне матар'яльных і культурна-бытавых умоў вучняў—важнейшыя вагары ў разьвіцьці і рабоце ФЗВ

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ РАБОТУ ФЗВ.

Сацыялістычная прамысловасьць прад'яўляе ўсё большыя і большыя патрабаваньні на кваліфікаваную рабочую сілу.

Адзін з асноўных крыніц задавальненьня патрэб у кадрах зьяўляецца працоўная моладзь, якая атрымоўвае адпаведную кваліфікацыю ў школах фабрычна-заводзкага навучэньства і ў школах масавых прафэсій.

На сёньняшні дзень у школах гэтага тыпу навучаецца 9.700 чалавек, а ў 1932 г. пачне вучыцца ФЗВ і школ масавых прафэсій дасягне 22.300 чалавек.

У сувязі з гэтым зараз асаблівае значэньне набываюць пытаньні якасьці работы школ і паляпшэньня матар'яльна-бытовога становішча вучняў.

Побач з бясспрэчнымі посьпехамі ў гэтай галіне, у наяўнасьці цэлы рад даволі буйных недахопаў.

У нездавальняючым становішчы знаходзіцца вытворчае навучаньне. Да гэтага часу няма праграм вытворчых пляваў навучаньня, ня зьнішчаны нэлпавацельскія адносіны адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводаў да навучаньня падлеткаў, да ФЗВ.

На цэлым радзе заводаў («Домбаль», «Чырвоная Бярэзіна», «Бальшэвік») парушаецца савецкае законадаўства. Падлеткі, у тым ліку вучні ФЗВ, на гэтых заводах ня выведзены з начных зьмен, працуюць звышнармова, няма асобных гудкоў для заканчэньня работы падлеткаў.

Самым вузкім месцам у разьвіцьці і рабоце ФЗВ зараз зьяўляецца будаўніцтва. Цэлы рад гаспадарчых аб'яднаньняў у адносінах да будаўніцтва памяшканьняў пад ФЗВ праяўляюць агідную нядбайнасьць. Аб гэтым надзвычай ярка гавораць матар'ялы аб становішчы віцебскіх ФЗВ. Марудныя тэмпы капітальнага будаўніцтва школ і інтэрнатаў, недастатковасьць жыльлёвай плошчы ўжо прывялі да зрыву і перабоў у рабоце асобных ФЗВ.

Дрэнна таксама пастаўлена грамадзкае харчаваньне вучняў цэлага раду школ фабрычна-заводзкага вучнёўства. Нярэдкі выпадкі, калі вучні забясьпечваюцца горш, чым рабочыя прадпрыемствы, пры якім існуе ФЗВ.

Падкрэсьліваючы наяўнасьць гэтых недахопаў, СНКБ у спэцыяльнай пастанове вызначыў цэлы рад канкрэтных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх павінна забясьпечыць павышэньне якасьці навучаньня і паляпшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня вучняў ФЗВ.

СНК даручыў «ДЗЯРЖПЛЯНУ РАСПРАЦАВАЦЬ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ РАЗГОРТВАНЬНЯ СЕТКІ ШКОЛ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКАГА ВУЧНЁЎСТВА І ШКОЛ ВУЧНЁЎСКА-МАСАВЫХ ПРАФЭСІЙ ТАКІМ ЧЫНАМ, КАБ ДАХАПІЦЬ ІМІ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ НЯ МЕНШ 60 ПРОЦ. ПАДРЫХТАВАНЫХ КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ КАДРАЎ».

Асаблівая ўвага павінна быць аддана пытаньням ЯКАСЬЦІ работы як у галіне вытворчага, так і агульна-адукацыйнага навучаньня.

Патрэбна да канца выкараніць бясспрэчнасьць, бяссыстэмнасьць, элементы адрыву практыкі ад тэарэтычнага навучаньня.

Побач з тым, што павінна быць узьнята якасьць навучаньня па агульна-адукацыйных дысцыплінах, патрэбна стварыць усе неабходныя ўмовы для найлепшай пастаноўкі вытворчай практыкі.

Неабходна дабіцца таго, каб гаспадарчыя арганізацыі ў тэрмін выканалі дырэктывы СНК «аб перадачы 20 мэтвляапрацоўчых варштатаў школам фабрычна-заводзкага вучнёўства.

Разам з гэтым правесьці мабілізацыю інструментаў з унутраных рэсурсаў фабрык і заводаў, з мэтай перадачы іх да новага навучальнага году школам фабрычна-заводзкага вучнёўства і школам вучнёўства масавых прафэсій. Уключыць з 1 студзеня 1932 году забясьпячэньне абсталяваньнем школ ФЗВ і школ масавых прафэсій у першачарговае».

Патрэбна дабіцца крутога пералому ў адносінах гаспадарчых арганізацый да будаўніцтва памяшканьняў пад школы ФЗВ. Нельга далей цярпець такога становішча, калі да школьнага будаўніцтва, і ў прыватнасьці да будаўніцтва ФЗВ адносяцца як да справы апошняга значэньня.

Усе меры павінны быць зараз прыняты да таго, каб не дапусьціць зрыву капітальнага будаўніцтва ФЗВ.

Павышэньнем якасьці навучаньня, добрай пастаноўкай вытворчай практыкі, паляпшэньнем матар'яльнага культурна-бытавога абслугоўваньня вучняў забясьпечым бесьперабойную работу кузьні кваліфікаваных рабочых кадраў—ФЗВ.

НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ЗРЫВУ ВУЧОБЫ

Цэлы рад віцебскіх школ ФЗВ надзвычайна дрэнна забясьпечаны памяшканьнямі. Так, ФЗВ швэйнікаў, у якім навучаецца 500 вучняў, знаходзіцца ў вельмі дрэнным памяшканьні.

Такія ўмовы адмоўна ўплываюць на якасьць вучобы.

З-за адсутнасьці інтэрнату ФЗВ панчошнай фабрыкі прымушаны былі скараціць набор вучняў.

ФЗВ мэталістаў таксама ня мае памяшканьня. Часова заняткі адбываюцца ў клюбе мэталістаў.

Побач з гэтым дрэнна стаіць справа з абсталяваньнем. У ФЗВ няма ніводнага фрэзэрнага варштату, у той час, калі ў праграме прадугледжваецца падрыхтоўка кадраў фрэзэршчыкаў.

У ФЗВ кулінараў з-за адсутнасьці памяшканьня распушчан увесь набор, а ФЗВ «Дзьвіны» паменшыла набор на 40 чалавек. Па гэтай-жа прычыне сарвана адкрыцьцё ткацкага цэху ФЗВ на 60 асоб. Пачатае будаўніцтва памяшканьня пад ФЗВ будаўнікоў спынена з тае прычыны, што Белбудаб'яднаньне ня плоціць грошай за зробленую работу.

Такое-ж становішча і па іншых ФЗВ.

Партарганізацыя, камсамол, прафсаюзы пытаньнем будаўніцтва ФЗВ ня цікавяцца. Гарсавет таксама ня прыняў патрэбных мер, каб забясьпечыць фабзавучы памяшканьнем.

Віцебскі гарком КП(б)Б і гарКК абавязаны прыняць самыя тэрміновыя меры для таго, каб адвесьці пагрозу зрыву навучаньня ў Віцебскіх школах фабрычна-заводзкага вучнёўства.

Зарубежны.

За якасьць вучобы, за прамфінпляні

Гэтымі днямі швэйнікі БССР адзначалі вялікую перамогу — выкананьне пяцігодкі за тры гады.

Фабзавуч імя КІМ'у, які знаходзіцца пры фабрыцы «Кастрычнік», вырас у гэтай вялікай барацьбе. Мы можам з упэўненасьцю сказаць, што вучні, якія працуюць у нашым ФЗВ, за два гады атрымаюць добрую кваліфікацыю і выйдуць добра адукаванымі. Фабзайцы, разам з усім рабочым калектывам, упарта змагаюцца за выкананьне вытворчай праграмы.

Старшыня прафкому ФЗВ «К. М.» т. Хазановіч.

Мы за паўгодзьдзе 1931 году выканалі прамфінплян на 105 проц., за трэці квартал — 103,1 проц. і за 10 дзён чацьвертага кварталу — на 103,9 проц. Калі ў 1930 годзе выпуск паліта цягнуўся 8 гадзін 39 мінут, то ў чацьвертым квартале ён цягнецца 6 гадзін 3? мінут.

Але трэба адзначыць, што якасьць нашай прадукцыі стаіць не на належнай вышыні. Таму мы зараз праводзім месячнік паходу за паляпшэньне якасьці. Арганізавана 45 ударных брыгад, у якіх налічваецца 700 чалавек. Заключаны сацдагавары паміж вучасткамі, агрэгатамі, і зараз мы заключаем сацдагавор з ФЗВ швэйнікаў г. Смаленску.

Шостая камсамольская ячэйка, абмяркоўваючы прамфінплян чацьвертага кварталу, высунула сустрэчны плян і пастанавіла выканаць яго за два з палавай месяцы. Яе прыкладу пасьледавалі іншыя цэхавыя ячэйкі ЛКСМ.

Шырока разгарнуўся выпуск цэхавай штодзенкі. Гэта выклікана выпускам шматтыражкі нашага ФЗВ «Нашы кадры».

Усе гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйна-камсамольскай арганізацыі. Вучні ФЗВ і надалей з усёй упартасьцю будуць змагацца за якасьць вучобы, за прамфінплян.

С. ГОЛЬДЗІН.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

ДЭКАДА БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎШЧЫКАЎ

З 1 да 10 КАСТРЫЧНІКА ПА БССР ЗАГАТОЎЛЕНА УСЯГО 4,3 проц. ГАДАВОГА ПЛЯНУ

Дабіцца максымальнага ўзмацненьня тэмпаў загатовак. Шырэй сацспаборніцтва, ударніцтва, масава-палітычную работу. Рашуча націснуць на кулацка-заможныя элемэнты, прымусіць іх поўнасьцю і неадкладна выканаць цьвёрдыя заданьні

Апэрацыйная зводка

аб ходзе збожжазагатовак БССР па становішчы на 10 кастрычніка

НАЗВА РАЁНУ	% вык. гад. пляну
Аршанскі	42,7
Асьвейскі	78,0
Бабруйскі	42,6
Бешанковіцкі	28,1
Віцебскі	38,3
Вушацкі	14,7
Гарадоцкі	36,5
Горацкі	65,8
Гомельскі	102,5
Дрысенскі	—
Дубровенскі	48,9
Крупскі	21,8
Лёзьнянскі	26,1
Лепельскі	25,2
Менскі	26,2
Магілеўскі	31,9
Мсьціслаўскі	26,9
Полацкі	38,0
Расонскі	38,0
Сеньненскі	14,0
Сіроцінскі	12,0
Сураскі	58,9
Талочынскі	49,3
Чавускі	16,9
Чашніцкі	26,0
Шклоўскі	50,8
Усяго па сыстэме Белкаапсаюзу	35,7
Асіповіцкі	8,5
Барысаўскі	25,3
Брагінскі	25,6
Буда-Кашалёўскі	31,9
Быхаўскі	38,9
Вятомльскі	10,0
Валожынскі	42,3
Бярэзінскі	32,5
Веткаўскі	37,2
Глускі	24,5
Жлобінскі	40,6
Жыткавіцкі	27,5
Заслаўскі	30,1
Камарынскі	19,2
Кармянскі	29,5
Каралінскі	20,7
Касьцюковіцкі	37,9
Клімавіцкі	33,4
Клічаўскі	8,4
Койданаўскі	15,0
Капыльскі	25,7
Чырвонапольскі	39,5
Крычаўскі	31,6
Лагойскі	35,5
Лельчыцкі	17,2
Лоеўскі	39,9
Любаньскі	17,9
Мазырскі	26,6
Нараўлянскі	46,0
Парычкі	40,7
Пленчаніцкі	28,4
Прапойскі	22,6
Пухавіцкі	15,5
Пятрыкоўскі	9,4
Рагачоўскі	24,8
Рачыцкі	25,5
Слуцкі	20,2
Смалявіцкі	30,7
Старадарожскі	12,1
Старобінскі	30,6
Тураўскі	8,7
Уваравіцкі	56,2
Вузьдзенскі	23,7
Хойніцкі	38,5
Церахаўскі	43,6
Чачэрскі	24,5
Чырвонаслабодзкі	30,6
Чэрвенскі	10,5
Чэрыкаўскі	23,8
Усяго па сыстэме Белхлебжывёлсаюзу	27,3
РАЗАМ	29,2

Пакончыць з самацёкам

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Першая дэкада кастрычніка не дала ніякага ўзруху ў ходзе збожжазагатовак. **Ня 12 кастрычніка гадавы плян па раёне выканан усяго на 28,5 проц.**

Дагэтуль яшчэ не разгорнута масавараслумачальная работа сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Раўнацца па Мосырскім, Клінскім і М.-Далецкім сельсаветах

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

Вушацкі раён павінен загатовіць у гэтым годзе 1.300 тон збожжа. На 5-га кастрычніка загатоўлена толькі 256 тон, што складае 19,7 проц. пляну.

Чым тлумачыцца прарыў? Асноўная прычына — апартуністычная недвацэнка збожжазагатоўчай кампаніі з боку раду сельсаветаў. ІСАЙСКІ, ГЛЫБАЧАНСКІ, ГАРАДЗЕЦКІ, ЧАРАПОЎШЧЫНСКІ І. В.-САРОЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ЗДАЛІ ЯШЧЭ НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА. У некаторых сельсаветах нават не праведзены сходы беднаты і серадняку па пытаньні аб збожжазагатоўках.

У ЗАВЯЧЭЛЬСКІМ сельсавеце член праўленьня калгасу «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ» ЛЁЛЯ выступіў на агульным сходзе супроць здачы збожжа дзяржаве. Зразумела, што клясавы вораг карыстаецца гэтым для сваёй падрыўной работы супроць збожжазагатовак.

Патрэбен карэнны пералом. Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа перакінуць збожжазагатоўкі на баявыя рэйкі. Усе сельсаветы раёну павінны раўняцца па МОСЫРСКІМ, КЛІНСКІМ І М.-ДАЛЕЦКІМ сельсаветах, якія паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы і выканалі гадавы плян збожжазагатовак звыш чым на 60 проц. З кулацка-заможных гаспадарак у гэтых сельсаветах цьвёрдыя заданьні акаль поўнасьцю ўжо спагнаны.

ЛІПАЎКА, БАРЫСЕНАК.

Г. ВАЙЦІНСКІ

Манчжурскі вузел і кітайская рэвалюцыя

Японія пашырае сваю акупацыю ў Манчжурыі.—Ва ўмовах сусьветнага крызісу імпэрыялісты пёгка пераходзяць да вырашэньня сваіх супярэчнасьцяй сілай зброі.—Гаміндана́ўская контр-рэвалюцыя папегчыла задачу японскіх імпэрыялістаў,—Антыяпонскі рух перарастае ў магутны ўздым народных мас.—Расьце новая хваля нацыянальна-вызваленчага руху ў Кітаі.

Акупацыя японцамі Манчжурыі, якая пачалася фактычна 19 верасьня гэтага году, разьвіваецца далей. Запэўненьне прадстаўніка Японіі ў Лізе Нацый Іошы зава, як і ўсяго японскага ўраду, аб тым, што гэта толькі меры часовыя і войскі будуць адкліканы, зразумела, аказаліся толькі фармальнымі, разьлічанымі на заспакаеньне грамадзкай думкі ў самой Японіі і за рубяжом. На самой-жа справе зараз адбываецца далейшае «аваеньне» захопленых тэрыторый і заняваньне глебы для далейшага пашырэньня акупацыйных пляноў.

Адначасова з заявамі вайсковага міністэрства з Токіё аб адводзе войск з некаторых раёнаў, займаюцца новыя пункты, як, напрыклад, у апошнія некалькі дзён Таунань і Сапуны; распаўсюджваюцца весткі аб магчымасьці заняцьця цыцкаро. Гэта паказвае, што акупанты «аэруляюць» тэрыторыю ўсёй Манчжурыі, імкнучыся даволі далёка на Поўнач.

Весткі аб тым, што ва ўнутранай Манголіі, у прыватнасьці ў раёне Жэхе, арганізуецца новы ўрад, «самастойны ад Кітая», само сабой зразумела, зьяўляецца выражэньнем ажыцьцяўленьня пляну японскіх мілітарыстаў, якія выказвалі ня раз сваю думку аб неабходнасьці ўключэньня ўнутренай Манголіі ў выключную сферу японскага ўплыву. Яшчэ ў 1915 годзе ў вядомым 21 патрабаваньні японскіх імпэрыялісты намецілі ўнутраную Манголію як адзін з аб'ектаў свайго захопу. Далейшыя весткі аб тым, што ў Барзе, пад кіраўніцтвам мясцовых нацыяналістаў, на чале з вядомым японскім агентам Мэрсэ чакаецца выступленьне з мэтай стварэньня незалежнага ўраду, пралічваюць сьвітло на новы крок наступленьня японскіх імпэрыялістаў. Сьцягваньне сюды расійскіх белагвардзейцаў, якія знаходзяцца на палясе алтужэньня, дапаўняюць гэту карэйну авантуры ў Паўночнай Манчжурыі. Нельга, зразумела, не бачыць у сувязі з усімі гэтымі фактамі за пакой у раёнах Кітайска-Усходняй чыгункі.

Манчжурыя такім чынам стала аб'ектам увагі ня толькі народных мас Кітая Японіі і Карэі, але і пралетарыяту СССР і капіталістычных краін. Адкрыты напад японскага імпэрыялізму на Манчжурыю паказвае, з якой лёгкасьцю імпэрыялісты ва ўмовах сусьветнага крызісу пераходзяць да вырашэньня сваіх супярэчнасьцяй шляхам зброі.

Па пытаньні аб акупацыі Манчжурыі імпэрыялісты на даным этапе яшчэ фактычна трымаюцца адзінага фронту. Францускія імпэрыялісты адкрыта абараняюць дасягні Японіі, лічачы гэтыя дасягні правільнымі ня толькі з пункту погляду інтарэсаў Японіі, але і ўсяго капіталістычнага сьвету. Француская праса высьмейвае першыя выступленьні прадстаўніка Англіі ў Лізе Нацый Сэсіля, яго прапанову паслаць камісію расьсьледаваньня ў Кітай і пастанову Лігі Нацый абвясьціць Злучаным Штатам Амэрыкі аб гэтым. Як вядома, Сэсіль зараз-жа ад сваёй прапановы адмовіўся. Гэта выступленьне характарызавала ў вядомай меры пазыцыю Англіі, хаця і не зашкаўленай ва ўмацаваньні Японіі на Далёкім Усходзе, але якая ня лічыла магчымым у сучасных умовах выступаць з якой-небудзь рашучай палітыкай.

У даным пытаньні пазыцыя Англіі, відавочна, акрэсьлівалася прыстасаваньнем да Амэрыкі і Францыі, адносіны якіх да Японіі выявіліся ў факце ўзваленьня адраднікага нападу на Манчжурыю.

Злучаныя Штаты Амэрыкі, якія прабавалі на працягу многіх год дастасаваць свой прынцып «адчыненых дзьвярэй» у Манчжурыю, г. зн. захапіць гэту частку Кітая эканамічна, як сферу свайго ўплыву, дабіліся дзякуючы ўзросшай сіле пасьля сусьветнай вайны толькі таго, што японцы (часткова з-за націсканьня ПАЗШ) адкладвалі ажыцьцяўленьне сваіх ранейшых плянаў у Манчжурыі. Асабліва ўзрос уплыў ПАЗШ у Кітаі з 1922 г., пачынаючы з Вашынгтонскай канфэранцыі, на якой японскім імпэрыялістам прышлося пайсьці на рад уступак (уход з Шаньдуна і парушэньне дагавору з Англіяй). У далейшым, пасьля паражэньня кітайскай рэвалюцыі амэрыканскія імпэрыялісты правялі вялікую ініцыятыву ў арганізацыі кітайскай контр-рэвалюцыі. Яны прыналі першымі нанкінскі ўрад і дапамагалі яму стаць цэнтрам буржуазна-памешчыцкай контр-рэвалюцыі ў краіне. Барацьба паміж Амэрыкай і Японіяй на ўсекітайскай арэне знаходзіла сваё выражэньне ў бесьперапынных генэральных войнах, якія вяліся ў Кітаі за апошнія некалькі год. Само сабой зразумела, што гэтыя войны (Чан Кай-шы супроць Чжан Цзо-ліна, потым Чан Кай-шы супроць Фэн Юй-сяна і Ен-Сі-шана, і, нарэшце, Нанкін супроць Кантона) выяўлялі сабой у апошнім яздольнасьць кітайскай контр-рэвалюцыі ажыцьцявіць нацыянальнае аб'яднаньне Кітаю. Барацьба імпэрыялістаў паміж сабой у гэтых умовах за ўплыў на Кітай яшчэ больш узмацніла міжусобныя генэральскія войны. У Кітаі ёсьць у наяўнасьці цэлае перапляценьне супярэчнасьцяй інтарэсаў імпэрыялістычных дзяржаў (англа-амэрыканскія супярэчнасьці, англа-японскія і інш.) Аднак, больш усяго праяўляліся супярэчнасьці японска-амэрыканскія.

У Манчжурыі, дзе японскі ўплыў быў найбольш моцны і дзе асноўная чыгуначная магістраль знаходзіцца ў іх руках, японска-амэрыканскія супярэчнасьці праяўляліся другім шляхам: кітайскія мілітарысты пачалі пераарыентоўвацца ў бок ПАЗШ. Японскія імпэрыялісты бачылі, як манчжурскія сатрапы, спачатку Чжэя Цзо-лін, а потым і Чжан-Сюэ-лян і Чжан Цзо-сян усё больш пачынаюць праяўляць схільнасьць да выхаду з падпяволеньня японскаму ўплыву, набліжаючыся да амэрыканцаў. Больш таго, самы саюз паміж Нанкінам і Мукдэнам і ўцыняцце ў Манчжурыі гаміндана́ўскага сьцягу было, зразумела, дасягнута не без ўмяшальня ПАЗШ.

Усе гэтыя факты, якія сьведчаць аб укараненьні амэрыканскага ўплыву ў Манчжурыю пры пануючым уплыве амэрыканцаў у Нанкіне, не зважаючы на выклікаць вялікай боязьні з боку японскіх імпэрыялістаў. Ваенная кліка ў Японіі пачала біць трывогу. Найбольш асьцярожныя прадстаўнікі японскай буржуазіі супраціўляліся плянам неадкладных ваенных выступленьняў. Але японскія кіруючыя групы

СЕНЬНЯ-ЗІМОВЫЯ ПЕРАВОЗКІ

ЛІКВІДАВАЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ ВАГОНАУ

Жывёлазагатоўкі

Клічаўскі жывёлазагатоўчы апарат патрабуе аздараўленьня

КЛІЧАЎ. Гадавы плян жывёлазагатовак па КЛІЧАЎСКІМ РАЁНЕ ня выкананы. Замест 1.123 тон загатоўлена толькі 726 тон.

Укамплектаваньне саўгасаў і калгасаў Клічаўшчыны жывёлай сарвана. Паводле пляну загатоўчыя арганізацыі павінны былі здаць жывёлагадоўчым калгасам і саўгасам у трэцім квартале 392 гал. цялят, здана-ж усяго... 8 цялят.

Саўгасу БАЦЭВІЧЫ трэба было здаць 400 сьвінаматак, здана-ж толькі 17.

РАЙКААПСАЮЗ злачынна ігнаруе дырэктыву Белмяса аб адборцы бэконных сьвіней. Паводле гэтай дырэктывы, райкаапсаюз павінен быў да 1 кастрычніка перадаць аддзяленьню Белмяса 750 сьвіней, аднак дагэтуль да рэалізацыі пляну нават яшчэ не прыступлена.

Дзе прычыны ганебнага прарыву ў жывёлазагатоўках?

Асноўная прычына—нікуды ня вартая пастаноўка працы загатоўчых органаў. Даволі сказаць, што па ўсім раёне ніяк ні аднаго прыёмачнага пункту жывёлы. Загатоўкі вядуцца—толькі 5-ю агентамі шляхам разьезду па сельсаветах і вёсках. Такім чынам, у пяці пунктах, куды выяжджаюць агенты, яшчэ сяк-так вядуцца загатоўкі, у астатніх-жа сельсаветах і вёсках ніякай загатоўчай работы няма. Зусім зразумела, што пакуль загатоўшчыкі пасьпеюць пабываць у 5-10 пунктах ва многіх другіх мясцох жывёла разбазарваецца на прыватным рынку. Загатоўчыя арганізацыі ня ўжываюць ніякіх мер для арганізацыі сеткі прыёмачных пунктаў па раёне.

Ніякіх інструкцый і стандартаў для прыёмкі жывёлы няма. Агенты прымаюць жывёлу «на вока». У выніку ёсьць шмат фактаў злоўжываньня з боку агентаў.

Зусім адсутнічае ўлік загатовак жывёлы ў разрэзе сельсаветаў. Раённыя арганізацыі ня ведаюць, як выконваюцца пляны жывёлазагатовак пасобнымі сельсаветамі, у якім сельсавеце прарыў, як спаганяюцца цьвёрдыя заданьні з купацка-заможных гаспадарак і г. д.

У райкаапсаюзе ляжыць куча дагавораў на закантрактаваную жывёлу ў адасобным сэктары. Аднак, да гэтага часу ніхто не прявяе паступленьня жывёлы па кантрактацыйных дагаварох. Не ўстаноўлен таксама кантроль за выкананьнем самаабвязацельстваў бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак па здачы жывёлы.

Па сыстэме СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ ёсьць выпадкі злачыннага ўзлуваньня загатоўчых цэн. Так, у КЛІЧАЎСКІМ І БАЦЭВІЦКІМ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВАХ за адну карову, якая паводле ўстаноўленых Наркамснабам цэн каштуе 70 руб., плацяць 200 руб.

Нагледзяюцца таксама факты агіднага разбазараваньня жывёлы самімі загатоўшчыкамі. Старшыня ЗАПОЛЬСКАГА сельсавету перадае жывёлу забраную ў кулакоў за няўплату абавязковых плацяжоў БАЦЭВІЦКАМУ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВУ, а апошняе бяз усякіх нарадаў расходуе гэту жывёлу для мясцовай сталоўкі. Гэты-ж Запольскі сельсавет перадае нароў і сьвіней калгасам, якія зусім ня маюць заданьняў па ўкамплектаваньні жывёлы. Так, калгасу «ПАРЫСКАЯ КАМУНА» перадана нядаўна 7 кароў. Такія факты маюць месца і ў іншых сельсаветах.

Некаторыя работнікі, якія працуюць на жывёлазагатоўках, злачынна адносяцца да сваіх абавязкаў і часта пад відам ад'езду на загатоўкі едуць да дому ўбіраць бульбу са сваіх гародаў (КАЦМАН, КЛЮЧ, ПЛАКСА).

У загатоўцы сьвіней ёсьць факты яўнага шкодніцтва. Загатоўшчыкі КЛЮЧ І ФІНКЕЛЬШТЭЙН зусім адмаўляліся ад прыёму сьвіней, матывуючы тым ніби «па раёне сярод сьвіней лютуе чума» Каапупаўнаважаны па Запольскім сельсавеце СУШКО паведаміў райкаапсаюзу, што «сьвіньні ў гэтым сельсавеце хварэюць чумой, у сувязі з чым нельга весьці загатоўкі». Пасьля праверкі доктарам саўгасу Бацэвічы сапраўднага становішча на мясцох, усё гэта аказалася хлусьнёй—ніякай чумы сярод сьвіней на было, загатоўшчыкі проста не жадалі весьці загатоўкі.

Плян жывёлазагатовак на 1931-32 год райкаапсаюзам атрыман 2 кастрычніка. Аднак да гэтага часу да рэалізацыі яго яшчэ не прыступлена.

***

Органы пракуратуры павінны зацікавіцца работай жывёлазагатоўчых арганізацый Клічаўскага раёну. Вінаватых у злачынным зрыве жывёлазагатовак, трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Неабходна прымусіць загатоўчыя арганізацыі пераключыцца на сапраўды баявыя тэмпы работы, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну чацьвертага кварталу і ліквідацыі дапушчаных прарываў.

ГАЛЬНСКІ.

РАПАРТ КАСЬЦЮКОВІЧА ЦК КП(б)Б—т. ШАРАНГОВІЧУ СНК БССР—т. ГАЛАДЗЕДУ

КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б З ПОСЬПЕХАМ ВЫКАНАЛА ДЫРЭКТЫВУ ЦК І СНК АБ ЗАГАТОЎКАХ МЯСА. НА 20 КАСТРЫЧНІА ЗАМЕСТ 124 ТОН, ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАМ, ЗАГАТОЎЛЕНЫ 164 ТОНЫ. ДА 1 ЛІСТАПАДА ЗАБЯСЬПЕЧАНА ВЫКАНАНЬНЕ 35 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ПЛЯНУ.

15 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЖАН ЧЫРВОНЫ ЭШАЛЁН З БУЛЬБАЙ У ЛІКУ 40 ВАГОНАЎ ДЛЯ ПРАЛЕТАРАЎ ЛЕНІНГРАДУ. НА 20 КАСТРЫЧНІКА РЫХТУЕЦЦА ДРУГІ ЧЫРВОНЫ ЭШАЛЁН З БУЛЬБАЙ. ПЛЯН АДГРУЗКІ НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ВЫКАНАН НА 77 ПРОЦ. ДА 20 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЗКА БУДЗЕ ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧАНА.

САКРАТАР РК КП(б)Б МІРОНЕНКА.
СТАРШЫНЯ РВК РАМАС.

БЕЗДАКАЗНЫЯ АДНОСІНЫ ВІЦЕБСКІХ ДЫСПЭТЧАРАЎ ЗЬМЯНШАЮЦЬ СКАРЫСТАНЬНЕ ВАГОННАГА ПАРКУ НА ТЫСЯЧУ ГАДЗІН

Вопыт кіраўніцтва памочніка начальніка Полацкай станцыі тав. Смаляка паказвае, як трэба працаваць

Самаабавязацельствы віцебскіх чыгуначнікаў

У сувязі з надыходзячым пленумам ЦК КП(б)Б, на Віцебскім вузле нагнетаецца рост актыўнасьці і вытворчага ўзьлыму.

Ва ўсіх службах і вытворчых адзіках (цяга, эксплёатацыя, дэпо), адбыліся нарады трыкутнікаў. Праведзена вузлавая нарада партыйнага, прафэсыянальнага і гаспадарчага актыву. Дэтальна абгаворана становішча вузла і прынята рад канкрэтных мерапрыемстваў па ліквідацыі прарываў.

Напрыклад, па службе цягі асноўны прарыў існуе ў цэху, дзе робіцца праміўка. Арганізацыі дэпо ўзялі на сабе абавязак:

Узмацніць гэты цэх кваліфікаванай рабочай сілай, стварыць спэцыяльны кантрольны дошкі, устанавіць цьвёрды графік, які прадугледжвае неабходны час прамыўкі паравозаў. Перад падачай паравозаў у рамонт устанаўліваць дэтальны аб'ём рамонту.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў дасьць магчымасьць давесьці процант хворых паравозаў да ўстаноўленай нормы і зьнішчыць выпадкі несвячасовай падачы паравозаў пад цягнікі.

Работнікі службы цягі паставілі перад сабой задачу павялічыць работу паравозаў і вагонаў у часе руху ня менш чым на 1 гадзіну за лік зьмяншэньня прастою паравозу ў рамонце і экіпірэўцы. Таксама строга прытрымлівацца вызначанага часу ў цуці і стаянцы на станцыях.

Прыняты адпаведныя меры па зьнішчэньні зрыву спаранай ягды, якая галоўным чынам бывае на віне качараў.

Па цэху абточкі. Устанавіць каляндары тэрмін абточкі паравозаў з давядзеньнем гэтага пляну да кожнай брыгады і паасобнага вучастку работы. Сачыць за тым, каб прастої паравозаў у абточцы ня перавышалі ўстаноўленых 72 гадзін. Разборку паравозаў рабіць, згодка пляну. Строга сачыць за свячасовай падачай неабходных дэталяй.

Па такарным цэху—канчаткова зьніш чыць брак, устанавіць персанальную адказнасьць мацнёраў за прыёмку дэталяй. Праверыць эфэктыўнасьць праведзенага агляду норм і расцэнак з тым, каб канчаткова ліквідаваць ураўніліўку. Загадзя паведамляць рабочых аб умовах новага нараду паказаньнем расцэнак на кожным працэсе паасобку. Канчаткова правесьці спаранасьць варштатаў.

Прымацаваць вучняў да пастаянных майстраў. Пераглядзець аплату іх работы і ўстанавіць узнагароды майстром за лепшае навучаньне. Штодзённае вытворчае заданьне даводзіць да кожнай брыгады.

Па службе эксплёатацыі правесьці на 100 проц. спэцыялізацыю і маршрутызацыю цягнікоў.

Зьменшыць прастої вагонаў на адну гадзіну.

Сачыць за тым, каб ні адзін вагон ня быў адпраўлен без дакумантаў па віне станцыі і каб ня было затрыманьня вагонаў па віне таварнага двара ў часе нагрузкі і выгрузкі.

Для пасьпяховага выкананьня прынятых абавязацельстваў, партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі чыгункі павінны мабілізаваць адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал і рабочую масу. Трэба рашуча перабудаваць усю работу з такім разьлікам, каб надыходзячаму Пленуму ЦК КП(б)Б рапартаваць буйнымі перамогамі ва ўсіх галінах работы чыгуначнага вузла.

А—з.

Ня выпадкі, а сыстэма

Ад аперацыйнай работы дыспэтчарскага апарату і кіраўнікоў станцыі залежыць бесперабойны ход асенняга-зімовых перавозак. Але па простым эксплёатацыйным раёне з боку пасобных работнікаў дыспэтчарскага апарату і кіраўнікоў станцыі назіраюцца нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў. Вось некалькі прыкладаў:

8-га кастрычніка на станцыі Віцебск былі паданы пад разгрузку 3 вагоны бульбы для ТПО. Замест таго, каб падаць іх у 5 пакгаўз, вагоны былі паданы ў 4 і прастаялі цэлыя сутки. Па заўтра былі незакрытымі работы для выгрузкі бульбы, але гэтых вагонаў не аказалася і ніхто ня ведае, дзе яны дзеліся.

Такіх фактаў шмат. Няправільная падача вагонаў, засынка іх — гэта ня выпадкі, а сыстэма ў рабоце Віцебскага вузла.

Зусім дрэнна пастаўлена работа таварнага двара. Памочнік начальніка Віцебскай станцыі Пятроўскі, накуль даведзнецца аб наяўнасьці вагонаў, дык грузчыкам у колькасьці 180 чалавек, прыходзіцца траціць цэлыя гадзіны.

Агенты-разьмеркавальнікі на выгрузцы і пагрузцы — Сьцяпанаў, Ткачэнк і інш. замест таго, каб своячасова забясьпечваць грузчыкаў работай, цэлы прасіджваюць у канцылярыі, таму брыгады грузчыкаў «гуляюць».

На станцыі Боркавічы грузчыкі таксама стаяць цэлымі дзнямі выключна з-за несвячасовай падачы паражняка. Так, 8-га кастрычніка цягнік № 705, які дастаўляе паражняк станцыі Боркавічы, замест 9 г. 40 хв. прыбыў на станцыю ў 15 гадзін 30 хвілін. Грузчыкі станцыі Боркавічы ў колькасьці 60 чалавек, прасталі больш 6 гадзін, чакаючы вагонаў.

Нельга прайсьці міма злодзіцкіх паводзін начальніка станцыі Боркавічы — Данілава, які на сходзе прысьвечаны абгаварэньню выкананьня транспарту і новых ставак аплаты заявіў: «устаноўленыя раёнам нормы выпрацоўкі і расцэнкі не даюць магчымасьці грузчыкам зарабіць». Па пытаньні заключэньня дагавораў з клієнтурай па не абавязковых работах, ён таксама сказаў: «жная справа раёну, калі мы зьдзярэм з клієнтуры на аплату грузчыкаў», і агітаваў супроць устаноўленых раёнам норм і расцэнак.

Ёсьць агідныя факты і на ст. Полацак. Так, 7 і 8 кастрычніка 30 вагонаў з балясам пад пагрузку прастаялі 48 гадзін. Дзяжурны станцыі нічога не зрабіў, каб падаць пад пагрузку гэтыя вагоны ў той час, калі патрэбная рабочая сіла мелася поўнасьцю. Па віне дзя журных станцыі Полацк, вагон з аўсом на адрас Саюзхлеба, у пошуках свайго месца разгрузкі, блукаў па станцыі 24 гадзіны (пакгаўз Саюзхлеба знаходзіцца побач са станцыяй).

Ня лепш стаіць справа на ст. Лёзна. Ёсьць шмат выпадкаў, калі прыбываюць вагоны з грузам без адпаведных дакумантаў. Так на ст. Лёзна прыбылі дакументы на пляцформу № 382781 у той час, калі сам пляцформа аказалася за № 692120. Пакуль начальства разабралася, дык пляцоўка прастала 18 гадзін.

На станцыі Копысь 5 вагонаў у чаканьні прыцэпкі прасталі агулам 360 гадзін і г. д.

Добрае аперацыйнае кіраўніцтва паказаў нам. начальніка Полацкай станцыі па тавара-станцыйных работах, тав. Смаляк. Ён фінплян давёў да кожнай брыгады і кожнага грузчыка паасобку. Ва ўсіх брыгадах створаны трыкутнікі. Работа брыгад пераведзена на індывідуальную зьдзельшчыну, што спрыяла канчатковай ліквідацыі ўраўніліўкі. Устаноўленыя пьвёрдыя нормы выпрацоўкі сыстэматычна пераконваюцца (сярэдняя норма 13 тон, фактычна выпрацоўваецца 14 тон). Кожная брыгада замацавана за адпаведнай работай. Зараз праводзіцца падрыхтоўка на пераводзе брыгад грузчыкаў на гаспадарчы разрахунак (першы вопыт па МВБ). Адна брыгада грузчыкаў ужо пераведзена на гаспадарчы разрахунак. Паводле сацдагавору, які заключан з брыгадамі грузчыкаў ст. Масква МВБ, грузчыкі станцыі Полацк свае абавязкі перавыконваюць.

Сярод грузчыкаў адчуваецца творчы ўздым і вялікая актыўнасьць. Усе брыгады паміж сабою заключылі сацыялістычныя дагаворы на лепшае выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў трансфінпляну. Хваля сацспаборніцтва разгортваецца ўсё больш і больш.

Вазьмі прыклад паказваюць брыгады грузчыкаў у справе дапамогі свайму падшэфнаму саўгасу. Брыгады кожныя 5 дзён высылаюць 25 чалавек для капаньня бульбы.

Прыклад работы брыгад грузчыкаў у Полацку павінен быць перанесен у астатнія брыгады грузчыкаў усяго Віцебскага раёну.

Арк. Зарубежны.
М. Чыгуначны.

На мэханізацыю-нуль увагі

Што-ж зроблена Менскім чыгуначным вузлом па рэалізацыі прапаноў тав. Сталіна? Амаль нічога.

— Для нашых гаспадароў і адміністратараў прапановы Сталіна ня існуюць—заявіў рабочы грузчык Цаховіч, выступаючы 18 верасьня на партсходзе, і ён мае рацыю.

Калі ўзяць мэханізацыю, дык адразу ўбачыш бязьдзейнасьць адміністрацыі. На мэханізацыю было вызначана 80 тыс. руб. Што-ж зроблена па гэтай галіне? Нічога. У ваеннрадмазе Пабудаваны 2 лябёдкі, але яны не працуюць. Дарэмна патрацілі грошы. Вышка таксама не працуе, транспартыр стаіць. Клієнтура і гаспадары менскай чыгункі на гэту справу глядзяць скрозь пальцы.

Пры базе ЦРК шлях не рамантуюць; пойдуць дажджы і грузчыкам нельга будзе працаваць. На млыне «Араджэньне» рабочыя цягнуць мяшкі на горад певерх. Мэханізацыя адстае. База БТС не падрыхтавала патрэбнай колькасьці саўкоў, з-за чаго таксама работа адцягваецца.

На прамысловай базе лябёдкі не працуюць,дзьверы не адпавядаюць пагрузкам. На базе Дяржснабу няма мосьцікаў, з-за чаго пры разгрузцы гэтымі днямі пабілі шыбы.

На 701-ай вярсьце няма чакальні для рабочых. Рабочая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна, яна не прымацавана да вучасткаў, існуе абязьлічка. Вагаўшчыкі, кладаўшчыкі несвячасова зьяўляюцца на работу.

Які-ж вывад можна зрабіць з паказаных фактаў? А тое, што для гаспадарнікаў, адміністрацыі і клієнтуры Менскага чыгуначнага вузла прапановы тав. Сталіна ня існуюць.

ДЭКАДА „ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ"

Больш машын сацыялістычнаму сэктару сельскай гаспадаркі!

З 14-ці заводаў, аб'яднаных Белмэталяаб'яднаньнем, два найбольш магутных заводы — «Гомсельмаш» і «Чырвоны мэталіст» працуюць выключна для патрэб сельскай гаспадаркі. Апрача таго, мэталяапрацоўчыя заводы, якія знаходзяцца ў розных прамысловых цэнтрах БССР, па меры неабходнасьці, абслугоўваюць рамонтнымі работамі патрэбы сельскай гаспадаркі. У прыватнасьці, магілёўскі завод «Чырвоны адраджэнец» перад пасеўнай кампаніяй быў занят рамонтам трактараў.

Спэцыялізацыя двух заводаў выключна па с.-г. машынабудаўніцтве вынікае з асноўнай установкі — мэханізаваць найбольш працаёмкія працэсы сельскай гаспадаркі і падвесьці пад яе тэхнічную базу. У сувязі з тым, што спэцыялізацыя самой сельскай гаспадаркі БССР ідзе ў напрамку разьвіцця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, дык гэта ставіла і ставіць пэўныя патрабаваньні ў спэцыялізацыі саміх заводаў.

За апошні час твар заводаў радыкальна зьмяніўся. Калі ў мінулым аліны завод Белмэталяаб'яднаньня — «Чырвоны мэталіст», які абслугоўвае сельскую гаспадарку, выпрацоўваў с.-г. прылады для індывідуальнай гаспадаркі—веялкі, малатарні з конскім прыводам, плугі, а «Гомсельмаш», які ў той час праектаваўся, меркавалі спэцыялізаваць для вырабу ручных малатарань, саламарэзак і веялак, што таксама разьлічвалася на задавальненьне патрэб адпаасобнай гаспадаркі, дык зараз намэнклятура выробаў гэтых двох заводаў істотна зьмянілася.

Заводы пачалі выробляць такія машыны, як жмыхадрабілкі, корнярэзкі, бульбарэзкі, саломарэзкі, сіласарэзкі, бульбамыйкі, бульбасартоўкі, канюшнасартоўкі і г. д. Па некаторых відах гэтых машын плян 1932 г. дае рост на 200-300 проц. і больш. Напрыклад, бульбарэзкі — рост на 432 проц., саломарэзкі—рост на 483 проц. і г. д.

Калі прыведзіцца да ўказаных вышэй відаў машын, дык мы бачым, што заводы ў значнай частцы прыстасаваны для задавальненьня патрэб жывёлагадоўчых гаспадарак, спрыяючы пашырэньню кармовай базы, бо кармовая база ёсьць асноўная ўмова для вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы. Усе гэтыя машыны разьлічаны на задавальненьне патрэб буйных гаспадарак.

Неабходна адзначыць, што ўсе бяз выключэньня с.-г. машыны, вытворства якіх наладжана на заводах Белмэталяаб'яднаньня, да гэтага часу ў Саюзе не выпрацоўваліся.

Аўладаньне на працягу году цэлым рядам новых машын было зьвязана з вялікімі труднасьцямі і патрабавала ад усяго рабочага калектыву і грамадзкасьці заводаў вялікіх намаганьняў у справе яўладаньня тэхнікай гэтага вытворства. Гэтыя труднасьці мінулі і ў сучасны момант выпуск асноўных машын носіць масавы характар. Для ілюстрацыі прыведзем некалькі лічбаў: выпуск бульбакапалак у першым паўгодзьдзі 1931 году складаў—0, у лістападзе —200, у жніўні—630, у верасьні—807.

Выпуск сіласарэзак: за першае паўгодзьдзе 1931 году—464 штомесячна, у лістападзе—703, у жніўні—844.

Побач са станоўчымі момантамі ў рабоце заводаў і значнымі дасягненьнямі па аўладаньні новымі машынамі і пастаноўкай вытворства ў масавым парадку, побач з аб'ектыўнымі прычынамі, якія тармазілі плянавую работу заводу (несвячасовае снабжэньне, частая зьмена вытворчых праграм) — у рабоце заводаў ёсьць яшчэ нямала слабых месц, да гэтага часу нізкіх як у галіне арганізацыі працы, так і ў галіне арганізацыі вытворчасьці. Праграма, вызначаная на 1932 год, дае аб'екты большменш асвоены (за выключэньнем новай сіласарэзкі «Блізард»), пры зьнішчэньні прычын суб'ектыўнага характару, пры большай зацікаўленасьці грамадзкасьці ня толькі заводаў і Белмэталяаб'яднаньня, але і грамадзкасьці адпаведных арганізацый — праграма будзе выканана, тэхнічная база сельскай гаспадаркі значна пашырана, вызваліўшы тым самым новыя тысячы рабочых рук, якіх патрабуе сацыялістычная прамысловасьць.

Б. М. А.

Абавязацельствы варашылаўцаў

Рабочы калектыў заводу імя Варашылава свячасова і па-баявому адгукнуўся на пастанову ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Пры заводзе арганізаван шэфскі куст, які складаецца з 12 ячэек розных устаноў гораду. Шэфскі куст падзелен на рад паасобных брыгад, якія прымацаваны да кожнага калгасу.

На працягу ўсяго году ўсімі брыгадамі праводзілася сыстэматычная работа па арганізацыі новых калгасаў, увядзеньні зьдзельшчыны, уліку працы, разьмерка ваньні ўраджаю і інш. Было накіравана шмат брыгад спэцыялістаў па рамонце сельска-гаспадарчага інвэнтару, якімі праведзена значная работа.

У выніку сыстэматычнай і ўпартай работы калектыў заводу імя Варашылава дабіўся ў сваіх падшэфных сельсаветах значнага проценту калектывізацыі. Так, Грычанскі сельсавет калектывізаван на 95 проц. Уведзена зьдзельшчына па ўсіх калгасах.

Невыстарчальна праводзіцца работа па разьмеркаваньні ўраджаю ў паасобных калгасах з прычыны адсутнасьці рахунковых работнікаў.

Рабочыя-шэфы заводу імя Варашылава распрацавалі рад канкрэтных мерапрыемстваў для правядзеньня ў падшэфных сельсаветах: да канца 1931 году наладзіць усебаковы ўлік у 5 калгасах, арганізаваць сыстэматычную дапамогу ў выкананьні пасеўных плянаў, наладзіць работу пасьпенных газэт, правесьці поўную ліквідацыю нэпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод калгасьнікаў.

ЭСТЭРКІН.

НА ШТУРМ БЕЗДАРОЖЖА.

Слабое разгортваньне ўдарніцтва

—адна з асноўных прычын прарываў у дарожным будаўніцтве

„Аб'ектыўныя прычыны" прарываў

Дырэктывы ЦК КП(б)Б аб месячніку штурму бездарожжа рэалізуюцца на 4-й дыстанцыі нездавальняюча. Адна з асноўных прычын прарываў — ВЕЛЬМІ СЛАБОЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ САЦСПАБОРНІЦТВА І УДАРНІЦТВА. Рабочыя заключылі 12 дагавораў на сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на першае выкананьне пляна работ. Але ў зьвязку з тым, што энтузіязм рабочых ня быў замацаваны, што прафарганізацыі дрэнна кіравалі ўдарным рухам, дагавары не далі яшчэ належных вынікаў. Напрыклад, трэба было загатовіць 21.825 кбм. каменьня, загатоўлена 18.824 кбм. разьбіта толькі 75 проц. патрэбнай колькасьці шчэбня; праведзена шасы 25 проц. заданьня і г. д.; забрукавана плошчы ў 4 разы менш, чым вызначана плянам.

Прафарганізацыі дыстанцыі ня сталі на чале ўздыму вытворчай актыўнасьці мас. Прэміяльны фонд сацспаборніцтва вельмі дрэнна, ня гледзячы на тое, што сярод рабочых ёсьць ударнікі, работа якіх заслугоўвае самага шырокага захвочваньня. Толькі ў апошнія дні рабочкам выпучыў 18 лепшых рабочых для прэміяваньня.

Атрад Аўтадору № 1 ня выконвае узятых на сябе абавязкаў. Бываюць частыя прастої машын, аварыі і паломкі.

Культурна-асьветная работа сярод рабочых не разгорнута. У выніку — частыя выпадкі п'янак і гульні ў карты.

2-і аўтаатрад нараба 5 ня ўключыўся ў месячнік штурму. Атрад мае 16 машын і каля 60 рабочых, але гэтыя машыны скарыстоўваюцца дрэнна, бо працадысцыпліна не на вышыні, сацспаборніцтва не разгорнута. Ёсьць прагулы і спазьненьні на работу.

Значны ўплыў на пасьляховае выкананьне пляну дарбудаўніцтва аказвае правільная пастаноўка грамадзкага харчаваньня. Кіраўніцтва 4-й дыстанцыі ў гэтых адносінах дабілася пэўных посьпехаў. Сярод рабочых няма скаргаў на работу сталоўкі. Але трэба адзначыць, што Каменскае сельспажыўтаварыства «перагібае» ў гаспадарчым разрахунку: нядаўна абед каштаваў 50 кап., з 8-га кастрычніка абед тэй-жа якасьці каштуе ўжо 70 к.; капі на дыстанцыю прыбываюць новыя рабочыя і адміністрацыя паведамляе каапэрацыю, што ёй перавядзены грошы на водпуск абедаў і для новых рабочых, спажывецкае таварыства не адпускае прадуктаў, пакуль не атрымае паведамленьне з банку, на што ўходзіць 2-3 дні.

Мясцовыя арганізацыі мала займаюцца пытаньнем дарожнага будаўніцтва і часта ігнаруюць запатрабаваньні дарожных арганізацый. Лепельскі РВК, напрыклад, чыста фармальна падышоў да гэтай справы. У памятцы, складзенай для брыгадзіраў, якія ад'яжджаюць у сельсаветы, РВК піша: «Улічваючы набліжэньне канца сэзону па дрожным будаўніцтве, неабходна прыняць усе меры для свячасовага скончэньня будаўніцтва дарог. Трэба на 100 проц. скарыстоўваюць рабсілу на дарожным будаўніцтве ў дождлівыя дні, калі прыпыняюцца работы на полі». Апошняя агаворка зводзіць на нішто адзначаныя раней катэгарычныя паказаньні. Хто будзе ў дождж працаваць на дарожным будаўніцтве? У выніку нарады на рабгужсіпу, даныя РВК сельсаветам, ня выконваюцца і часта самавольна скарачаюцца. Прудаўскі с-с, які павінен за пяцідзённу даць 100 фурманак, не дае ніводнай.

Маскальнянскі сельсавет, які павінен быў даць 3-га кастрычніка 50 фурманак, даў толькі 4. Александраўскі сельсавет з 250 фурманак не паслаў ні аднэй.

Выязная рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь», якая выпускае ў раёне сваю газэту, ні аднаго радка ня прысьвяціла дарожнаму будаўніцтву.

Да канца дарожных работ засталося мала часу, і таму кіраўніцтва 4-й дыстанцыі павінна зрабіць усё магчымае, каб выканаць поўнасьцю плян дарожных работ, каб прымусіць сельсаветы рэалізаваць даныя ім нарады.

Брыгадзір «Зьвязды» — Н. НАЎМОВІЧ.

Абмяжаваліся рэзалюцыямі

ГОМЕЛЬ. Гомельскія арганізацыі адразу-ж адгукнуліся на пастанову ЦК КП(б)Б аб месячніку штурму бездарожжа, вынесьлі рад рэзалюцый, стварылі штаб, але гэтым абмежаваліся і не прасачылі за тым, як выконваюцца дырэктывы, як ідуць работы на дарогах. Многія сельсаветы, калгасы і саўгасы ня прымаюць удзелу у месячніку штурму, штаб ніякіх мер да іх ня ўжывае, ні адзін з прадстаўнікоў штабу ня быў у сельсаветах.

Камсамольскія арганізацыі нездавальняюча ажыцьцяўляюць дырэктывы ЦК ЛКСМБ. Дагэтуль адпрацавана ўсяго 300 працадзён і то за лік гарадзкіх ячэек. Вясковыя ячэйкі ў штурму ня прымаюць удзелу. Паводле пастановы ЦК, Гомельскі гаркамол павінен быў мабілізаваць на пастаянную работу на 1-й дыстанцыі 30 камсамольцаў, дагэтуль мабілізаваны толькі 3. Гарпрафсавет гэтай работай зусім ня цікавіцца. Ён нават ня лічыў патрэбным стаяць пытаньне на сваім пасяджэньні.

БЭНІН.

Як Бягомль „даламагае" дарожнаму будаўніцтву

Працягваецца павінасьць мае вялізарнае значэньне ў справе будаўніцтва дарог. Усе раённыя савецкія арганізацыі павінны ўсямерна дапамагаць правядзеньню працягваецца павінасьці. Але Бягомльскі РВК ігнаруе дырэктывы па гэтым пытаньні.

Калі дасятнік 5-й дыстанцыі Антаневіч, прыехаўшы за дасятай кілёметраў у Бягомль, зьвярнуўся да РВК з просьбай даць распараджэньне аб тукпавінасьці, старшыня РВК Русак не захацеў нават таварыць з дасятнікам: «Аб чым мне з вамі таварыць, пішай дармовай палічнасьці няма». Выявілася што нават той сельсавет, які даў найбольшую колькасьць рабсілы на 5-й дыстанцыі, ад дыстанцыі адмаўляецца. Прышлося прыехаць у Бягомль начальніку дыстанцыі і намесьніку нараба. На гэты раз старшыня РВК Русак даў распараджэньне сельсаветам аб працягваецца, але не скасаваў распараджэньня жаконт адмаўляецца некаторых сельсаветаў. Трэба рэзкаваць на такія адносіны з боку рабітных савецкіх органаў.

Дарожнік.



Дзянная і добрая дарога.

Фэрма—асноўны цэх жывёлагадоўчага калгасу

У дэкаду „калектывізацыі і ўраджаю" разгорнем масавы агляд падрыхтаванасьці калгасных фэрм да зімоўкі

ЛІКВІДАЦЫЯЙ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПРАВІЛЬНАГА ДОГЛЯДУ ЖЫВЁЛЫ, ЭКАНОМНЫМ І БЕРАЖЛІВЫМ ВЫДАТКАВАНЬНЕМ КАРМОЎ—УЗЬНІМЕМ ТАВАРНАСЬЦЬ КОЖНАЙ ФЭРМЫ, ПАВЯЛІЧЫМ ДАХОДЫ КОЖНАГА КАЛГАСУ

Малочна-таварныя калгасныя фэрмы БССР, ня гледзячы на кароткі пэрыяд свайго існаваньня, дасягнулі значных посьпехаў у галіне арганізацыі калектыўнай жалочнай гаспадаркі і фармаваньні таварнага калгаснага стада.

70.000 кароў у калгасных фэрмах

Паводле заданьня партыі і ўраду да 1-га студзеня 1932 году калгасныя таварныя фэрмы павінны мець 78.000 таварных кароў. На 10 кастрычніка ў фэрмах БССР ужо сканцэнтравана 116.000 шт. рагатай жывёлы, у тым ліку 70.000 дойных кароў. Такім чынам заданьне партыі і ўраду ўжо выканана на 90 проц., а да канца году будзе значна перавыкананa.

Цікава прывесьці дынаміку арганізацыі і росту малочных фэрм. Калі на 1-га мая 1931 году на БССР было арганізавана 337 малочных фэрм з 29.089 шт., у тым ліку 20.367 кароў, дык на 1-га ліпеня мелася ўжо 619 фэрм з пагалоўем у 61.978 штук, з іх малочных кароў 39.113, на 1-га кастрычніка ўжо было 915 фэрм з пагалоўем у 110.404 шт., у тым ліку 65.274 малочных кароў. А на 10-га кастрычніка было 975 фэрм з пагалоўем у 116.183, у тым ліку 70.040 малочных кароў.

За апошнія 3 дэкады на фэрмы было пастаўлена 9.776 кароў, пры чым толькі 816 кароў прыпадае на куплю ў аддаленьных Белмяса і іншых калгасах. Рашта-ж прыпадае на абагульваньне кароў саміх калгасьнікаў.

Высокая таварнасьць перадавых фэрм

Калгасныя малочна-таварныя фэрмы на 10-га кастрычніка адалі (пралалі) дзяржаве 201.850 цэнтнэраў малака. Рад фэрм ужо ў першы год сваёй работы сталі сапраўды таварнымі малочнымі гаспадаркамі. Так, па матар'ялах 154 фэрм за май, чэрвень і жнівень з пагалоўя ўдою ў 23.543 цэнтнэры здана дзяржаве 21.443 цэнтнэры, што складае 77,8 проц. таварнасьці.

Многія фэрмы ня толькі пасьляхова выконваюць, але і перавыконваюць даныя злачы таварнай прадукцыі. Напрыклад, фэрма калгасу «Чырвоны працаўнік» (Гомельскі раён) адала 54 тысячы літраў замест 35 тысяч, паводле пляну, фэрма калгасу імя Карла Маркса (Слуцкі раён) адала 63.000 літраў пры гадавым пляне ў 50.000, фэрма калгасу імя Кастрычніцкай рэвалюцыі (Менскі раён) здала 111.400 літраў. Гэтыя гаспадаркі дасягнулі значных посьпехаў, дзякуючы творчаму энтузіязму калгасных мас, укараненьню сацыялістычных мэтадаў працы, узьдзеяньню сапраўднай зьдзельшчыны і ліквідацыі абязьлічкі.

Першыя вынікі работы паказваюць, што калгасныя фэрмы зьяўляюцца асноўнай формай у вырашэньні праблемы разгортваньня калгаснай жывёлагадоўлі.

За далейшае павялічэньне стада

Аднак, паказваючы станоўчыя вынікі сёньня, у дзень «Калектывізацыі і ўраджаю», мы ні ў якім разе ня можам прайсьці міма недахопаў, якія яшчэ ёсьць у справе арганізацыі і работы малочных таварных калгасных фэрм.

Перш за ўсё трэба падкрэсьліць, што здавальняючае выкананьне камплектаваньня фэрм, трэба аднесьці за кошт актыўнай работы перадавых раёнаў, якія сапраўды ўзяліся за рэалізацыю гістарычнай адозвы ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі.

Рад раёнаў прыходзяць да дня «Ураджаю і калектывізацыі» з нездавальняючымі паказальнікамі ў справе камплектаваньня калгаснага стада. У той час, калі Быхаўскі раён выканаў плян камплектаваньня на 123,5 проц., Рагачоўскі на 190,2 проц., Чырвонапольскі на 224,6

Год выданьня—XV
№ 253 (4139)
Субота, 17 кастрычніка
Цана нумара 6 кап.
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, СВЕРДЛОВА, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,—сакратар—10-74, парторгкам—12-80, прамысл.—13-84, сав. земл.—6-12, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-18, навы рэдактар—6-12, рэдакцыйная інфармацыя—10-74, камсамол—7-51, бюро скарг—7-51

ВАЕННЫЯ САМАЛЕТЫ ЯПОНІІ ДЭМАНСТРУЮЦЬ СУПРОЦЬ ПАЗШ

ПА УСЁЙ ТЭРЫТОРЫІ ПАУДНЁВАЙ МАНЧЖУРЫ РАЗГОРТВАЮЦЦА БАЯВЫЯ ДЗЕЯНЬНІ

ВОСТРЫ ЭКАНАМІЧНЫ І ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС ПАДХЛЁСТВАЕ АКУПАНТАУ

Вакол Шанхай-Гуану сканцэнцэнтраваны вялікія сілы Кітаю і імпэрыялістаў

ТОКІЁ, 15. Паводле паведамленьня газэт ваенныя ўлады лічаць, што становішча ў **Шанхай-Гуане**, дзе, паводле вестак японскага друку, сабраны войскі Чжан Сюэ-ляна **ускладняецца**. Прымаюцца меры на выпадак нападу кітайскіх войск на японцаў. Асобна адзначаецца складанасьць становішча з поваду таго, што па поўдзень ад Шанхай-Гуану знаходзіцца атрад войск **ПАЗШ у 1.500 чалавек, Вялікабрытаніі—1.000 чалавек, Францыі — 2.000 чалавек і Італіі — 300 чалавек.** Кітайскія войскі ў раёне Шанхай-Гуаня ўжо вылічаюцца ў колькасьці 150 тыс. чалавек, а ў самым Шанхай-Гуані знаходзіцца 30.000 чалавек. Японскія ваенныя судны і войскі ў гэтым раёне распрацавалі плян сумесных дзеяньняў у выпадку неабходнасьці.

Кітайскі пасол устрымоўваецца ад спатканьня

ШАНХАЙ, 15. Нанкінскі ўрад катэгарычна адхіляе чуткі, якія пашыраюцца з японскіх крыніц, быццам-бы нанкінскі ўрад гатоў пачаць непасрэдныя перагаворы з Японіяй. Прадстаўніку Кітаю ў Японіі Чжан Цзо-піну пасланы інструкцыі ўстрымацца ад спатканьня з японскім міністрам Сідэхара.

Амэрыканцы стараннa „абсьледуюць"

МУКДЭН, 15. Учора з Мукдэну ў Цынчжоу выехала амэрыканская камісія, якая абсьледавала становішча ў Манчжурыі.

„Ачыстка" раёнаў паводле японскага мэтаду

МУКДЭН, 15. Сёньня раніцою пачаліся буйныя перасоўваньні японскіх войск, якія атрымалі заданьне **«ачысьціць раёны», разьмешчаныя па абодвух берагох ракі Ляо паміж Мукдэнам і Сіньмынем.** З прычыны гэтага рух па Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы з сёньняшняй раніцы **спынен.** У сувязі з гэтым амэрыканская камісія, якая абсьледуе становішча Паўднёвай Манчжурыі, ня мела магчымасьці сёньня прайсьці ў Цзіньчжоу. Кореспандэнты амэрыканскіх газэт запрасілі японскія ўлады, чаму амэрыканская камісія загадзя ня была папярэджана аб спыненьні чыгуначнага руху, які меўся адбыцца. Старшыня японскага ваеннага камандаваньня заявіў, што амэрыканская камісія не інфармавала японскія ўлады аб сваім намеры адправіцца ў дарогу, і што пагроза з боку бандытаў раёну Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі настолькі вялікая, што паездка камісіі была-б небясьпечнай для жыцьця яе членаў. «Мы, — заявіў японскі прадстаўнік, — спачатку маем намер ачысьціць шлях, каб затым дапамагчы амэрыканскім назіральнікам абсьледаваць становішча».

Баі на ўсіх франтох

ТОКІЁ, 15. Паводле паведамленьня агенцтва «Дэмпо Цусін» з Мукдэну, учора адпраўлен японскі батальён у Чыу Лю ў 50 клм. на захад ад Мукдэну для ВАЕННЫХ ДЗЕЯНЬНЯЎ СУПРОЦЬ 5.000 КІТАЙСКІХ САЛДАТ, якія зьявіліся ў раёне. Учора адбываліся баі ў Цхавідыёнгу недалёка ад Чыу Лю. Як паведамляе газэта «Асахі», учора былі таксама баі ў Сінгпюнцызне ў Мукдэнскім раёне.

Забастоўка на японскім заводзе

ТОКІЁ, 15. 200 рабочых заводу Ішакавашыма абвясьцілі сёньня забастоўку ў знак пратэсту супроць звальненьня раду рабочых.

Сёньня ўцякло 15 мільёнаў

ТОКІЁ, 15. Спішы-банк сёньня апоў вывез на суму 15 мільёнаў іен золата ў ПАЗШ.

Расправы над карэйцамі

ШАНХАЙ, 14. Кітайскія газэты, якія выдаюцца ў Харбіне, паведамляюць: «У Гірыне па прыгаворы японскага ваеннага суда расстрэляны 6 карэйцаў».

Японскія тавары застаюцца на складах

ТОКІЁ, 15. Паводле даных эканамічных колаў, у сувязі з анты-японскім байкотам у Кітаі, у Шанхаі на складах буйнейшага параходзтва Японіі накапілася запасаў тканіны на 5 млн. іен.

Вялікія манэўры японскай авіяцыі

ТОКІЁ, 15. На морскай базе Іокасука пачаліся вялікія манэўры японскага паветранага флёту з удзелам насельніцтва. Задачай трохдзённых манэўраў зьяўляецца «адбіць паветраны напад на морскую базу з боку Гавайскіх і Філіпінскіх астравоў».

Новыя бамбардыроўкі

ТОКІЁ, 15. «Асахі» паведамляе з Чаньчуня, што ў 15 мілях на паўднёвы захад ад Чаньчуня ўчора зьявіўся кітайскі атрад з 100 салдат. У гэты раён неадкладна была пасланa японская часьць у 300 чал., якая ўчора ўжо бамбардыравала кітайскі атрад.

Новыя зьнішчыцелі пасланы ў Шанхай-Гуан

ТОКІЁ, 15. Газэта «Ніці-Ніці» паведамляе, што «ў сувязі з ускладненьнем становішча ў Шанхай-Гуане, начальнік морскага штабу Санегуцы прапанаваў адправіць у Цынвандао **некалькі зьнішчыцеляў».**

У Кантоне надзвычайнае становішча

ШАНХАЙ, 12. У Кантоне ўчора абвешчана надзвычайнае становішча. Між народны сэтлмэнт, памяшканьні японскіх фірм і вазьнейшыя ўрадавыя ўстановы ахоўваюцца моцнымі нарадамі кітайскай паліцыі і ваеннымі часьцямі.

Важнейшыя пастановы калегіі НКШЗ

Устаноўлены прэміі брыгадам таварных цягнікоў

МАСКВА, 16. На чарговым пасяджэньні калегіі НКШЗ пад старшынствам тав. Андрэева прынят рад важных пастаноў. Да гэтага часу прэміяльная ўзнагарода за вагон вылічвалася толькі паравозным брыгадам часажорскіх цягнікоў. Між тым спалучэньне таварных цягнікоў дасягае вялізарнейшых размераў. Калегія НКШЗ парашыла пашырыць прэміяльную сыстэму на вагоны і на паравозныя брыгады таварных цягнікоў. Падобныя прадпрыемствы перадаюцца непасрэдна дарогам. Пры НКШЗ **арганізуецца цэнтральнае кіраўніцтва** па цеплатэхніцы. Пастаноўлена прызначыць спэцыяльных кваліфікаваных працаўнікоў на правох намесьніка начальніка дэпо для нагляду за эканомным спальваньнем вугалю.

Аб ліквідацыі абязьлічкі вагонаў

Загад НК шляхоў зносін

Пытаньні барацьбы з абязьлічкай вагоннага парку, захаваньсьці вагонаў і аб мерах, павышаючых эфэктыўнасьць іх выкарыстаньня, становяцца ў даны момант такой-жа цэнтральнай праблемай работы транспарту, як і барацьба з абязьлічкай паравозаў у пэрыяд зімовых затрудненьняў мінулага году. Існуючая зараз абязьлічка таварных вагонаў (вагоны не прымацаваны да чыгунак, цры пераходзе з чыгункі на чыгунку пяма ня толькі тэхнічнага агляду вагонаў з боку прымаючай чыгункі, але практыкуецца і сыстэма «очкотпрацьства» з боку адаючай чыгункі, якая імкнецца сплавіць хворы вагон на другую чыгунку; як правіла ліквідаваны рамонтныя пункты ў мясцох абмену,— прыводзіць да адсутнасьці зацікаўленасьці і клопату чыгункі аб своечасовым рамонце вагонаў і да разбурэньня вагоннага парку. Выходзячы з неабходнасьці неадкладнай ліквідацыі такіх безгаспадарчых адносін да вагонаў, загадваю:

1. Кіраўніцтву эксплёатацыі супольна з дырэкцыямі чыгунак разьмеркаваць вагонны парк паміж чыгункамі, прымацаваўшы да іх вагоны ня толькі ў колькасным іх вылічэньні, але і на нумарным вучоце, усклаўшы на дырэкцыі чыгунак поўную адказнасьць за стан вагоннага парку, прымацаванага да дадзенай чыгункі, Перанумарацыя і прымацаваньне вагонаў павінны быць закончаны да 15 лістапада г. г.

2. Кіраўніцтву эксплёатацыі закончыць вызначэньне інвэнтарнага вагоннага парку кожнай чыгункі ў пяцідзённы тэрмін. Арганізацыю пунктаў абмену і двухбаковага тэхнічнага і камэрцыйнага агляду вагонаў кіраўніцтвамі цягі закончыць і ўвесьці поўнасьцю ў дзеяньне да 1-га сьнежня г.г.

3. Апэрацыі, зьвязаныя з перадачай вагонаў не павінны цягнуць за сабой павялічэньне існуючых норм прастою цягнікоў у пунктах перадачы. Арганізацыя перадатачных пунктаў павінна быць праведзена без павялічэньня існуючых на чыгунках штатаў, прычым кожная чыгунка павінна вылучыць на перадатачныя пункты больш кваліфікаваных спэцыялістаў-вагоньнікаў.

4. Кіраўніцтву цягі і дырэкцыям чыгунак неадкладна пачаць на чыгунках правядзеньне вагоннага парку ў пармальны тэхнічны стан, адбор і папярэдняе навучаньне кадраў, тэхнічную арганізацыю і дастасаваньне абменных пунктаў, падрыхтоўку кватэр для пэрсаналу і забесьпячэньне пунктаў тэхнічнага агляду рамонтнымі сродкамі і матар'ялам.

5. Для скарачэньня часу тэхнічнага агляду і неабходнага бягучага рамонту на пунктах перадачы з чыгункі на чыгунку арганізаваць бягучы рамонт у часе сьледаваньня цягнікоў пры стаянцы на станцыях і разьездах, стварыўшы для гэтага спэцыяльныя рамонтныя брыгады.

6. Кіраўніцтвам эксплёатацыі і цягі арганізаваць неадкладна ў трох пунктах вонышняю тэхнічную і камэрцыйную перадачу вагонаў і правесьці на іх папярэднюю праверку ўсіх вызначаных мерапрыемстваў.

Масква, 13 кастрычніка 1931 г.

Нарком шляхоў зносін
А. АНДРЕЕЎ.

Уборку гародніны скончыць да 20 кастрычніка

ПРЭЗЫДЫУМ БЕЛКААПСАЮЗУ ПРАПАНАВАЎ УСІМ ПРЫГАРАДНЫМ ГАСПАДАРКАМ КААПЭРАЦЫІ СКОНЧЫЦЬ УБОРКУ ГАРОДНІНЫ НЕ ПАЗЬНЕЙ 20 КАСТРЫЧНІКА.

ДЛЯ ПРЭМІЯВАНЬНЯ ГАСПАДАРАК, ЯКІЯ ВЫКАНАЛІ ПЛЯН УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ Ў ТЭРМІН, ВЫДЗЕЛЕНА 5 ТЫС. РУБ. З ГЭТАЙ СУМЫ БУДУЦЬ ПРЭМІЯВАЦЦА ЛЕПШЫЯ РАБОЧЫЯ-ЎДАРНІКІ, ЯКІЯ З ПОСЬПЕХАМ ВЫКАНАЛІ РАБОТУ ПА ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ.

Поўнае выкананьне плянаў загатовак да Кастрычніцкай гадавіны—лепшы адказ на заклік тульскага гарсавету

У сельсаветы накіравана 16 членаў каапэрацыйнай сэкцыі

У адказ на заклік тульскага гарадзкога савету пленум каапэрацыйнай сэкцыі Менскага гарсавету прыняў на сябе рад самаабавязацельстваў па прысьвячэньні перабудовы работы спажывецкай каапэрацыі.

Каапэрацыйная сэкцыя абавязалася да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня плянаў загатовак гародніны, бульбы і збожжа на 1931 год. Для гэтай мэты ў сельсаветы Менскага раёну камандыруюцца **14 членаў гарсавету.**

Паводле прынятых самаабавязацельстваў, каапэрацыйная сэкцыя павінна дабіцца засолкі, закваскі і захаваньня на зіму па засолачных пунктах 4.550 тон капусты, у сталоўках і крамах—200 тон капусты, сталовых кораньплодаў—1.630 тон, бульбы—10.600 тон і забуртваць сьнежай капусты 1.000 тон. На працягу дэкаднага тэрміну павінна быць зьнішчана чарга ў плодагародных крамах.

Для паляпшэньня абслугоўваньня работага спажыўца сэкцыя абавязалася падшукаць у рабочых раёнах Менску дадаткова ня менш 10 памяшканьняў для адкрыцьця плодагародных крам і двух памяшканьняў у цэнтры гораду для крам Сьвіноводтрэсту. На працягу дзьвёх дэкад павінна быць арганізавана ня менш 15 развозных паткоў.

Каапэрацыйная сэкцыя ўключылася ў каапэрацыйную эстафэту, якая праводзіцца ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю. Да Кастрычніцкіх сьвят будзе праведзен агляд каапэрацыі.

Саўгасы і калгасы Менскага раёну павінны дабіцца выкананьня пастановы СНК аб здачы ў горад ня менш 80 проц. агульнага ўдою малака.

Новыя цэны на с.-г. прадукцыю

Устаноўлены наступныя адпускныя цэны на с.-г. прадукцыю прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі: капуста позьняя—6 кап. кгр., бульба—4,8 кап., буракі сталовыя—6 кап., морква—8 кап., бруква—5,5 кап., цыбуля—14,5 кап. кілёграм. Адпускная цана ЦРК і раздробнай сеткі Белкаапсаюзу на малако ўстаноўлена ў 24 кап. літар. Новыя цэны ўведзены з 7 кастрычніка.

У адпаведнасьці з тэлеграфным распараджэньнем Цэнтрасаюзу аб адкрыцьці крам для продажу малочнай прадукцыі па камэрцыйных цэнах Белсельгасаб'яднаньню прапанавана падаць праект рэалізацыі 30 проц. малочнай прадукцыі прыгарадных гаспадарак па камэрцыйных цэнах.

Перад кастрычніцкімі сьвятамі

Прыезд замежных рабочых дэлегацый

НЕГАРЭЛАЕ, 14. (БЕЛТА). 14 КАСТРЫЧНІКА ПРЫЕХАЛА Ў СССР ПЕРШАЯ РАБОЧАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ НА КАСТРЫЧНІЦКІЯ СЬВЯТЫ З 79 ЧАЛ. СЯРОД ДЭЛЕГАТАЎ — 49 НЯМЕЦКІХ РАБОЧЫХ, 16 АЎСТРЫЙСКІХ, 10 ЭСТОНСКІХ, ТРЫ БЭЛЬГІЙЦЫ І АДЗІН АНГЕЛЕЦ. У СКЛАДЗЕ НЯМЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ — ГРУПА САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНЫХ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ ПРЫЕХАЛІ З МЭТАЙ АЗНАЁМІЦЦА СА СТАНОВІШЧАМ СССР.

У НЕГАРЭЛЫМ ГАСЬЦЕЙ СУСТРАКАЛІ ДЭЛЕГАЦЫІ РАБОЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ПРАДСТАЎНІКІ ЎсеЦСПС. НА ВАКЗАЛЕ САБРАЛАСЯ ШМАТ РАБОЧЫХ, З ЯКІМІ ДЭЛЕГАТЫ ПРАВЯЛІ ГУТАРКІ.

ПРЫЕХАЎШЫЯ ЗАМЕЖНЫЯ РАБОЧЫЯ ЦІКАВІЛІСЯ КУЛЬТУРНА-БЫТАВЫМІ ДАСЯГНЕНЬНЯМІ ПРАЦОЎНЫХ СССР. ДЭЛЕГАТ НЯМЕЧЧЫНЫ ГЕРЦ ЗАЯВІЎ: «ЗАРАЗ У НЯМЕЧЧЫНЕ КАЛЯ 5 МІЛЬЁНАЎ БЕСПРАЦОЎНЫХ; ЛІК ІХ ДА ЗІМЫ ДАСЯГНЕ 7 МІЛЬЁНАЎ. БУРЖУАЗІЯ ВЯДЗЕ ЎЗМОЦНЕНАЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ НА РАБОЧУЮ КЛЯСУ З МЭТАЙ ЯШЧЭ БОЛЬШ ЗНІЗІЦЬ МІЗЭРНЫ ЖЫЦЬЦЁВЫ ЎЗРОВЕНЬ ПРАЦОЎНЫХ. РАБОЧЫ-АЎСТРЫЕЦ ПАВЕДАМІЎ, ШТО ЁН АТРЫМЛІВАЕ ТОЛЬКІ 3 РУБ 64 КАП. ЗАРПЛАТЫ Ў ТЫДЗЕНЬ. СЯРОД ДЭЛЕГАТАЎ ЁСЬЦЬ РАБОЧЫЯ, ЯКІЯ ПЕРАЙШЛІ Ў КАМПАРТЫЮ ПАСЬЛЯ 20-ГАДОВАГА ЗНАХОДЖАНЬНЯ Ў РАДОХ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫІ. АСАБЛІВА ХАРАКТЭРНЫЯ НАСТРОІ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНЫХ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ: «МЫ ПАЕХАЛІ Ў СССР СУПРОЦЬ ВОЛІ НАШАГА КІРАЎНІЦТВА, ЗА ШТО ЧАСТКА ВЫКЛЮЧАНА З ПАРТЫІ, ДРУГІЯ БУДУЦЬ ВЫКЛЮЧАНЫ ПА ПРЫЕЗЬДЗЕ НАЗАД. ПРЫЕХАЎШЫ ДАМОЎ, МЫ РАССКАЖАМ УСЮ ПРАЎДУ АБ ТЫМ, ШТО МЫ БАЧЫЛІ Ў СССР».

Штурм прарываў у гаспадарчых кампаніях

КОЙДАНАВА. ПА РАЁНЕ РАЗГАРНУЛАСЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СЬВЯТ. ПРЫ РАЙКОМЕ КП(б)В СТВОРАНА СПЭЦЫЯЛЬНАЯ КАМІСІЯ. З 15 ПА 25 КАСТРЫЧНІКА ПРАВОДЗІЦЦА ДЭКАДА ШТУРМУ ПРАРЫВАЎ У ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ КАМПАНІЯХ. КОЖНАЯ ЯЧЭЙКА, СЕЛЬСАВЕТ І КАЛГАС МАБІЛІЗУЮЦЬ УСЕ СІЛЫ НА ФАРСАВАНЬНЕ ТЭМПАЎ УБОРКІ БУЛЬБЫ, МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ І ЗЯБЛІВА ДА 20 КАСТРЫЧНІКА БУДУЦЬ ПРАВЕДЗЕНЫ СХОДЫ ПА НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ, ПРЫСЬВЯЧАНЫЯ СЬВЯТКАВАНЬНЮ. 25 КАСТРЫЧНІКА НАЛАДЖВАЕЦЦА ПРАВЕРКА ВЫНІКАЎ ШТУРМУ. ТУДЫ, ДЗЕ ПРАРЫВЫ ЯЯ БУДУЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ, ПАСЫЛАЮЦЦА БРЫГАДЫ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ. ДА СЬВЯТ ПРЫСТАСОЎВАЕЦЦА АДКРЫЦЬЦЕ НОВЫХ ЯСЬЛЯЎ, ХАТ-ЧЫТАЛЕНЬ І СТАЛОВАК.

Уборка гародніны

Каапэрацыйныя гаспадаркі імя Лекерта, „Новы сьвет", і „Чырвоны маяк" свая-часова скончылі ўборку. Адстаюць гаспадаркі Гомелю і Рэчыцы

Плян уборкі гародніны ў прыгарадных гаспадарках спажывецкай каапэрацыі БССР выканан на 70 проц. УБРАНА 3.857 ГЭКТ. Кармовых кораньплодаў убрана 150 гэкт.—24 проценты, позьняй бульбы—460 гэкт.—33 проц. і г. д. ПЛЯН СІЛАСАБУДАЎНІЦТВА ВЫКАНАН НА 33 ПРОЦ.: пабудавана 42 тыс. кубамэтраў сіласных ям і траншэй. Засіласавана 13.557 тон—25 проц., зазяблена 3.356 гэкт.—8 проц. пляну Цэнтрасаюзу і 22 проц. заданьня Наркамзему. Пасеяна азімых 1.745 гэкт.—70 проц. пляну.

Уборка гародніны асабліва дрэнна праходзіць у ГОМЕЛІ і РЭЧЫЦЫ, дзе плян выканан усяго на 50 проц. Зусім нездавальняюча праходзіць сіласаваньне. Пагражаючае становішча з выкананьнем пляну зяблева.

Некаторыя каапгасы паказалі ўзорныя прыклады работы па ўборцы гародніны і бульбы. Так, каапгас ІМЯ ЛЕКЕРТА (Менск) скончыў уборку 9 кастрычніка, «НОВЫ СЬВЕТ» (Віцебск)—29 верасьня, «ЧЫРВОНЫ МАЯК»—11 кастрычніка.

Прэзыдыумы Белкаапсаюзу і беларускага камітэту саюзу рабочых зямлеробчых саўгасаў пастанавілі выдаць па 500 руб. кожнаму з гэтых каапгасаў для прэміяваньня лепшых ударных брыгад і пасобных ударнікаў. Адначасова выдзяляецца 6 месц у дамы адпачынку для пасылкі лепшых ударнікаў. Дырэктары паказаных каапгасаў прэміяваны месячным акладам пэнсіі.

Для ўзмацненьня вывазкі плодагародніны накіраваны ў гаспадаркі 5 аўтамашын. Пастаўлена пытаньне аб абавязчыньні ПЯЦІДЗЁНЬНІКА МАБІЛІЗАЦЫІ ГАРАДЗКОГА ТРАНСПАРТУ ДЛЯ ВЫВАЗКІ ПРАДУКЦЫІ З КААПГАСАЎ.

Надзвычай марудны тэмп зяблёва ставіць пад пагрозу падрыхтоўку гародніны плошчы да веснавой сэўбы. Не хапае цягавай сілы, зусім адсутнічаюць сродкі на правядзеньне мерапрыемстваў па асваеньні новаадведзенай плошчы ў 8 тыс. гэкт. У сувязі з гэтым Белкаапсаюз і Беларускі Камітэт саюзу зямляробчых саўгасаў зьвярнуліся ў Цэнтрасаюз з просьбай выдзеліць для БССР трактарную калёну, а таксама адпаведную суму грошай на асваеньне новых земляў.

Там, дзе ўборачная кампанія ня скончана, прапанавана пераключыць ня менш 50 проц. гужавога транспарту на зяблёва. Каапгасы, якія скончылі ўборку, павінны выкарыстаць для гэтай мэты ўвесь гужавы транспарт.

Каапгасам даны таксама ўказаньні аб паляпшэньні якасьці работы па ўборцы і абавязковым баранаваньні і перавораваньні бульбы.

Саўгасам і калгасам разгарнуць гандаль плодагароднінай

На працягу дэкады адкрыць 254 крамы і ларкі

Наркамзем і Наркамснаб БССР намецілі рад мерапрыемстваў па разгортваньні гандлю плодагароднінай. Белсаўгастрэсту прапанавана ў дэкадны тэрмін адкрыць для гандлю саўгасаў гароднінай і садавінай 8 крам у наступных гарадох: Менску—2, у Гомелі—1, у Бабруйску—1, Віцебску—1, Магілеве—1, у Воршы—1 і ў Барысаве — 1.

Белкалгасцэнтр і Белплодагароднікалгасцэнтр на працягу дэкады павінны адкрыць у гарадох і раёнах 6 плодагародных крам і 240 ларкоў для самастойнага гандлю калгасаў гароднінай і садавінай. У Менску калгасы павінны адкрыць 2 крамы і 20 ларкоў, у Віцебску—адну краму і 20 ларкоў, у Гомелі—1 краму і 15 ларкоў і г. д.

Наркамзем і Наркамснаб зьвярнуліся да гарсаветаў і райвыканкомаў з просьбай аказаць Белсаўгастрэсту і Белплодагароднікалгасцэнтру максымальную садзейнасьць у адкрыцьці плодагародных крам.

Плодагародніна ў крамах саўгасаў і калгасаў павінна прадавацца па тых цэнах, па якіх у данай мясцовасьці прадае каапэрацыя і дзяржаўны гандаль.

Адначасова ўсім саўгасам БССР даволены самастойны гандаль гароднінай і садавінай з вазоў і на рынках.

„НЕ ПРЫЗНАВАЙЦЕ НАДЗВЫЧАЙНЫХ ДЭКРЭТАЎ УРАДУ БРУНІНГА"—

заклікае рабочых кампартыя Нямеччыны

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ТАВ. РЭМЭЛЕ Ў РЭЙХСТАГУ.—УРАД БРУНІНГА НЕПАСРЭДНАЕ ЎСТУПЛЕНЬНЕ ДА ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ.—КАМПАРТЫЯ НЯМЕЧЧЫНЫ ПАДПОЛЬЛЯ НЕ БАІЦЦА

БЭРЛІН, 14. Ад імя камфракцыі выступіў з вялікай прамовай член ЦК кампартыі тав. Рэмэле. Абвясьціўшы ад імя кампартыі рашучую барацьбу ўраду Брунінга, тав. Рэмэле заявіў, што другі ўрад Брунінга будзе яшчэ **больш кароткачасовым, чым першы ўрад.** Першы ўрад Брунінга,— заявіў тав. Рэмэле,—**зьяўляўся ўрадам падрыхтоўкі да фашысцкай дыктатуры ў Нямеччыне.** Другі ўрад Брунінга зьяўляецца **непасрэднай уступнай фазай да фашысцкай дыктатуры.** Асноўнай задачай ураду Брунінга зьяўляецца разгуная барацьба супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту. Гаспадарчая палітыка ўраду Брунінга заключаецца ў тым, каб **абрабаваць працоўных у карысьць заможных клясаў.** Існаваньне і фашысцкая работа ўраду Брунінга магчымы толькі дзякуючы штрэйкбрэхерскай рабоце сацыял-дэмакратаў.

Кампартыя Нямеччыны будзе рашуча і ўсімі сродкамі змагацца супроць надзвычайных дэкрэтаў ураду Брунінга. **Палітыка надзвычайных дэкрэтаў зьяўляецца палітыкай фашызму.** Кампартыя Нямеччыны заклікае рабочых не прызнаваць надзвычайных дэкрэтаў. Надзвычайные дэкрэты забараняюць камуністычныя сходы, а кампартыя заклікае рабочых наладжваць сходы. Надзвычайныя дэкрэты забараняюць дэманстрацыі, а мы заклікаем рабочых, наперакор усім забаронам, выйсьці на вуліцу. Кампартыя не баіцца нелегальнага становішча. У падпольлі партыя будзе працягваць змагацца. У заключэньне тав. Рэмэле заявіў: **«Кампартыя не баіцца фашысцкага ўраду і высоўвае лёзунг зьвяржэньня ўраду Брунінга і барацьбы за савецкую Нямеччыну».**

За 50.000 тыраж „Зьвязды"

Слуцкі, Пухавіцкі і Лагойскі раёны на першым месцы па падпісцы

БАБРУЙСК.

З студзеня па кастрычнік бягучага году тыраж «Зьвязды» на раёне ўвесь час быў стабільны. Прыняўшы рад канкрэтных мер па прасоўваньні газэты ў рынокпія масы працоўных, газэтнае бюро дабілася росту тыражу. **На кастрычнік тыраж складае 1.370 экз. супроць 1092 экз. у верасьні.** Да ліку членаў партарганізацый падпіска складае 72 проц. **Райкому КП(б)Б, газэтнаму бюро і ўсёй грамадзкасьці Бабруйску трэба яшчэ больш разгарнуць работу па пашырэньні «Зьвязды», каб на працягу лістапада-сьнежня забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне лёзунгу: «Кожны камуністы і беспартыйны актывіст — падпісчык «Зьвязды».**

С.

***

ЧЫРЫКОЎ.

На кастрычнік, у параўнаньні з верасьнем, **падпіска на «Зьвязду» ў раёне павялічылася на 40 экз. і складае 373 экз.** Але гэтага мала. Калі падпіску параўнаць з лікам членаў партарганізацыі, дык яна будзе складаць толькі 65 проц. З гэтага вынікае, што пятрыкоўскім раённым арганізацыям, у першую чаргу **райкому КП(б)Б і газэтаддзелу, трэба ўжыць больш рашучыя канкрэтныя меры па распаўсюджаньні цэнтральнага органу КП(б)Б «Зьвязда».** Больш шырока разгарнуць масавую работу вакол газэты і па падпісцы.

Н.

***

Праводзячы штодзённую масавую работу вакол газэты, разгортваючы і ўзмацняючы падпіску, **рад раёнаў дабіліся значных посьпехаў у распаўсюджаньні «Зьвязды».** Падпіска ў такіх раёнах да ліку членаў партарганізацый складае:

Слуцкі — 262 проц.
Пухавіцкі — 162 проц.
Лагойскі — 140 проц.
Чэрыкаўскі — 139 проц.
Бярэзінскі — 115 проц.
Чэрвеньскі — 106 проц.

Лічбы выразна гаворацьь, што ў паказаных раёнах «Зьвязду» выпісваюць і чытаюць ня толькі камуністы, але і беспартыйны актыў.

Але побач з раёнамі, дзе справа з выпіскай «Зьвязды» стаіць здавальняюча, ёсьць многа раёнаў, якія маюць нязначную падпіску, дзе ў параўнаньні з лікам членаў партарганізацый падпіска складае мізэрны процант. Напрыклад:

Клімавіцкі — 26 проц.
Жлобінскі — 37 проц.
Гомельскі — 30 проц.
Расонскі — 41 проц.
Прапойскі — 44 проц.
Сеньненскі — 40 проц.
Камарынскі — 45 проц.

З гэтых даных відаць, што работа па распаўсюджаньні «Зьвязды» ў паказаных раёнах адсутнічае. У далейшым самацёк у гэтай рабоце павінен быць зьнішчан. Бяручы прыклад з перадавых раёнаў, райкомы КП(б)Б, газэтаддзелы і ўся грамадзкасьць раёнаў, якія адстаюць па падпісцы, павінны па-бальшавіцку, шырока разгарнуць работу, якая-б забясьпечыла максымальнае распаўсюджаньне «Зьвязды».

П.

***

БАРЫСАЎ.

У свой час Барысаў быў адным з перадавых раёнаў па падпісцы на «Зьвязду». На сёньняшні дзень карціна зьмянілася, барысаўцы здалі пазыцыі. **Па горадзе і раёне «Зьвязда» распаўсюджана зусім мала.** Усяго на кастрычнік **выпісваецца 824 экз.,** што да ліку членаў партарганізацыі складае 43 проц. Больш таго, у Барысаве атрымалася больш характэрнае зьявішча. Так, калі падпіску ў красавіку 1930 году (1.110 экз.) прынясьць за 100 проц., дык на кастрычнік бягучага году лічба падпіскі складае 74 проц. (або **паніжэньне на 24 проц.)** ў той час, як партарганізацыя вырасла за гэты час да 142 проц. **Такое становішча з распаўсюджаньнем «Зьвязды» атрымалася бязмоўна ў выніку поўнай адсутнасьці якой-бы там ні было работы вакол газэты і па яе прасоўваньні ў шырокія масы працоўных Барысаўшчыны.**

Газэтнае бюро, зьяўляючыся адзіным распаўсюджвальнікам друку, зусім нічога не зрабіла для напярэджаньня гэтага прарыву па шырокім распаўсюджаньні «Зьвязды», а цалкам аддалася самацёку. Райком КП(б)Б таксама пя толькі ня прымаў мер да пашырэньня ЦО КП(б)Б сярод шырокіх мас працоўных, а часамі і зусім ня цікавіўся гэтай справай.

М.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

ЧЕРВ. ЗОРКА — Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы замежны фільм **СЫН ЗОРА** у 8 ч. у гал. ролі Дугласа Фэрбэнкс
„КУЛЬТУРА" — Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы ўсходні савецкі фільм **УЗДЫМ** Звыш праграм. СТАЛІНГРАДЗКІ ТРАКТАРНЫ.
ПРАЛЕТАРЫ — Адч. з 12 г. дня. — МОНШ БЭНКС у замежн. фільме **ГОНІЧЫН СУПРОЦЬ ВОЛІ** Пач. 1-га сэансу ў 2 г. дня.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм **„ТРОЕ"** у 7 ч. Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" — Каса адкрыта з5 г. — Выдатны фільм **„КРУГ"** драма ў 7 частках

КІНО „Інтэрнацыянал" — Ад суботы, 17 кастрычніка — Вядомы мастацкі фільм з жыцьця ўсходу **Зэлімхан** — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—ХРОНІКА. Пачатак дзённых сэансаў у 2 гадз. дня. Пачатак вечарніх сэансаў у 6 г. 30 м. веч. Каса адкрыта з 12 гадз. дня. На дзённыя сэансы цэны зніжаны.

АБВЕСТКІ — 1 — ПАВЕДАМЛЕНЬНІ Ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца толькі да 2-х гадз. дня

8-й дыстанцыі **патрэбны** ПЕРШЫЯ і КОННЫЯ ГРАБАРЫ. Зьяўляцца па адрасе: Камуністычная, д. № 16, ад 9 г. раніцы да 5 г. вечара.

Інстытут Аздараўленьня і Арганізацыі Працы **арганізуе** ў КЛЮБЕ ПРАЦАСЬВЕТЫ **ЛЕКЦЫІ** НА ТЭМУ: „Прафкансультацыя і праблема кадраў" з дэманстрацыяй кінофільму „навуковы выбар прафэсіі" ДЛЯ ВУЧНЯЎ 6 і 7 ГРУПЫ І ІК БАЦЬКОЎ у наступныя дні: 17-X для школ №№ 5, 14, 15, 19, 22, 3. 19-X „ „ „ 18, 25, 36, 39. 21-X „ „ „ 6, 9, 10, 17, 20, 28. 22-X „ „ „ 7, 8, 12, 13, 21, 23, 30. 23-X „ „ „ 4, 27, 29, 33 34, 38.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Ігуменскі вэтэрынарны і Дрыбінскі сьвінагадоўчы тэхнікумы — прадоўжан да 1-га лістапада. Заявы накіроўваць непасрэдна ў тэхнікумы. Сьв. наводкалгасцэнтр.

Здадзен надрэз пры друкарні імя Сталіна АБВЯШЧАЕ ЧЭНЬНЫ НАБОР У ШУМП (школа вучн. мас. прафэсіі) для падрыхтоўкі разьбярэзьнікаў і наборшчыкаў. Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмерах 36 руб. першыя тры месяцы. Інтэрнату няма. Прыёмка заяў з 15 па 25 кастрычніка. Адказны надрэз.

УСЕБЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ